Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ВЕРАСНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 168 (28278)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НА ЛІНЕЙКУ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

31 жніўня, г. Мінск.

ГЭТЫ ДЗЕНЬ — АСАБЛІВЫ

Навучэнцам, студэнтам, аспірантам, настаўнікам, навукова-педагагічным работнікам

Дарагія сябры!

Віншую вас з Днём ведаў.

Гэта свята ўвасабляе непарыўную сувязь пакаленняў, перадачу мудрасці і вопыту ад бацькоў дзецям, ад настаўнікаў — вучням. Ва ўсе часы беларусы цанілі адукаванасць, майстэрства і прафесіяналізм, а сёння менавіта гэтыя якасці з'яўляюцца гарантыяй дабрабыту і ўстойлівага развіцця краіны. Таму мы ўдзяляем вялікую ўвагу захаванню лепшых традыцый айчыннай педагогікі, удасканаленню сістэмы навучання і выхавання падрастаючага пакалення.

У гэтым годзе школьны парог упершыню пераступяць больш за сто тысяч першакласнікаў, новы этап у спасціжэнні навук пачнецца для навучэнцаў і студэнтаў. Няхай час вучобы стане для вас светлым і цікавым, дапаможа рэалізаваць свае здольнасці і набыць месца ў жыцці.

1 верасня — асаблівы дзень для нашых педагогаў. Быць настаўнікам — гэта прызванне і лёс. Ад вашых прафесійных навыкаў і ўзроўню падрыхтоўкі залежаць дасягненні вучняў, а актыўная грамадзянская пазіцыя падкрэслівае ролю настаўніка ў грамадстве.

Жадаю, каб новы навучальны год прынёс усім вам поспехі ў працы і шчыры энтузіязм у асваенні новых ведаў, радасць творчага пошуку, шчасце і дабрабыт.

Са святам!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:

«Пераразлік працоўных пенсій з улікам росту сярэдняй заработнай платы работнікаў у краіне ў межах сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва будзе праведзены да канца гэтага года».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 24°
Віцебск	+ 20°
Гомель	+ 22°
Гродна	+ 23°
Магілёў	+ 21°
Мінск	+ 21°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.09.2016 г.

Долар ЗША	1,9605 ▲
Еўра	2,1851 ▼
Рас. руб.	0,0300 ▼
Укр. грыўня	0,0749 ▼

ISSN 1990 - 763X

СПРАДВЕЧНАЯ ПЕСНЯ НАД ДНЯПРОМ

XXIII ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА РАГАЧОЎ 2016

Святочную сцэну Дня беларускага пісьменства ўпрыгожыць 42-метровае люстэрка з арнаментам

XXIII Дзень беларускага пісьменства пройдзе ў Рагачове ўжо ў гэтыя выхадныя — 3—4 верасня. Гасцей і ўдзельнікаў свята, а таксама тых, хто сёлета (упершыню) зможа ўбачыць яго па тэлебачанні, чакаюць шматлікія сюрпрызы ад арганізатараў. Можна будзе даведацца пра любімыя кнігі беларускіх адказных асоб і народных артыстаў, пачуць найбольш упадабаныя вершы айчынных тэлевядучых і спевакоў, а таксама пазнаёміцца з беларусамі з 19 краін, якія прыедуць сюды прадстаўляць свае дыяспары.

— Раніцай 3 верасня ў Рагачове пачнуць сваю працу розныя тэматычныя пляцоўкі і выставы, у тым ліку «Геній зямлі беларускай» (да 125-годдзя Максіма Багдановіча), «Якуб Колас: жыццё і творчасць». Таксама пройдуць мерапрыемствы з нагоды 95-годдзя вядомага драматурга, ураджэнца Рагачова Андрэя Макаёнка, — адзначыў на сустрэчы з журналістамі **першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар ЛУЦКІ.** — Дзень 4 верасня пачнецца з пасадкі Саду малітвы, хрэснага ходу, святочнай літургіі ўдзельнікаў экспедыцыі «Дарога да святыняў».

СТАР. 2

■ Нерухомасць

Суцэльная хваля «шэрых» агентаў

Так званыя нелегальныя прадпрымальнікі ад нерухомасці занялі сёлета каля 20% другаснага рынку жылля ў Мінску

Вольныя маклеры ўсё актыўней пашыраюць сваю прысутнасць на сталічным рынку жыллёвай нерухомасці, чым ствараюць сур'ёзную пагрозу для спажыўцоў, паведаміў старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» (БелАН) Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ падчас «круглага стала», дзе разглядаліся і праблемы будаўніцтва жылля ў Мінску.

Без ліцэнзіі

Наш пастаянны эксперт адзначыў, што ценявы сектар на рынку жылля галоўнага мегаполіса краіны пачаў істотна павялічваць сваю прысутнасць апошнія два гады. Росквіту нелегальнага сектара рыэлтарскіх паслуг спрыялі адразу некалькі асноўных фактараў. Па-першае, зніжэнне плацежаздольнасці кліентаў, бо жаданне сэканоміць заўсёды прысутнічала сярод насельніцтва, а таксама адсутнасць у агенцтваў гнуткіх тарыфаў на свае паслугі, дзе дзяржава не дазваляе выкарыстоўваць сістэму зніжак. «У адрозненне ад рыэлтарскіх арганізацый, дзейнасць якіх жорстка рэгулюецца Міністэрствам юстыцыі, «шэрымі» агентамі, якія працуюць без рэгістрацыі і ліцэнзіі, практычна ніхто не цікавіцца. У прыватнасці, сфера інтарэсаў Мінюста на іх не распаўсюджваецца, хоць іх актыўнасць на рынку стала заўважная кожнаму», — адзначыў старшыня савета.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Партнёры

Таваразварот з В'етнамам можа павялічыцца да $500 млн

У гэтую пятніцу В'етнам адзначае свой 71-ы Дзень незалежнасці. Сёлета колькасць беларускіх турыстаў у гэтай азіяцкай краіне павялічылася на 65% у параўнанні з мінулым годам. Так, на падарожжах у В'етнам адбілася ўвядзенне мінулым летам бязвізавага рэжыму на паездку да 15 дзён.

У плане па развіцці двухбаковых адносін ёсць і павелічэнне таваразвароту да $500 млн да 2018 года. В'етнам з насельніцтвам больш за 90 млн чалавек з'яўляецца прывабным рынкам для замежных інвестараў. З 5 кастрычніка пачне працаваць зона свабоднага гандлю ЕАЭС і В'етнама, што, безумоўна, паўплывае на актыўнасць экспарцёраў і імпарцёраў.

— В'етнам працягвае праводзіць незалежную шматвектарную знешнюю палітыку, актыўна інтэгруецца ў міжнародны і рэгіянальны працэс і надае вялікую ўвагу ўмацаванню і развіццю адносін з сяброўскімі краінамі, — заўважыў пасол В'етнама ў Беларусі Ле Ань.

Пасля афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Ханой напрыканцы мінулага года актывізавалася двухбаковае супрацоўніцтва. Важным напрамкам у партнёрстве з'яўляецца арганізацыя сумесных зборачных вытворчасцяў на тэрыторыі В'етнама. Для гатовай прадукцыі будзе адкрыты і рынак АСЕАН. Акрамя гэтага, Ле Ань адзначыў, што в'етнамскі бок зацікаўлены ў перайманні беларускага вопыту будаўніцтва метро. Чакаецца, што ў пачатку наступнага года кіраўнік Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Чан Дай Куанг прыедзе з візітам у Беларусь.

Надзея АНІСОВІЧ

■

СПРАДВЕЧНАЯ ПЕСНЯ НАД ДНЯПРОМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Урачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства «Беларусь — спрадвечная песня» запланавана на 12 гадзін. Адразу пасля яго адбудзецца ўручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі. На конкурс было пададзена 30 твораў у розных літаратурных жанрах. Сёлета прэмію прысудзяць ва ўсіх 7-мі намінацыях. Пераможцы атрымаюць святочныя знакі-сімвалы, дыпломы і грашовыя прэміі. Асаблівым чынам запланаваны і фармат фестывалю кнігі і прэсы, будуць працаваць асобныя павільёны дзіцячай кнігі, літаратурная гасцёўня, выстаўка-прэзентацыя да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Усяго будзе праведзена каля ста мерапрыемстваў. Упершыню ў свяце беларускага пісьменства прымае ўдзел прадстаўнічая дэлегацыя беларусаў з 19 краін блізкага і далёкага замежжа.

Сёлета арганізатарам свята, сярод іншых, выступіў тэлеканал «Сталічнае тэлебачанне». **Намеснік генеральнага дырэктара Павел КАРАНЕЎСКІ** прыадкрыў таямніцу:

Фота БЕЛТА.

У дзіцячым аддзеле рагачоўскага Дома кнігі.

— Мы прапанавалі нашым ганаровым гасцям, якія завітаюць на Дзень пісьменства, прывезці ў падарунак Рагачову любімыя кнігі. І гэта не абавязкова навінкі — мажліва, кнігі з дзяцінства, найбольш дарагія сэрцу выданні. Пасля адкрыцця іх з дароўным надпісам можна будзе пакінуць у новым Доме кнігі. Такім чынам, кніга стане артэфактам! Мы звярнуліся таксама да вядомых артыстаў, спартсменаў, каб яны расказалі пра свае любімыя выданні — і гэта можна будзе ўбачыць не толькі на свяце, але і ў эфіры СТБ.

Для ўрачыстага адкрыцця тэлеканалам створана літаратурна-тэатральная пастаноўка, у якой паспрабавалі расказаць пра ўсё тое, чым багатыя беларусы. У ёй прымуць удзел народныя артысты Таццяна Мархель і Генадзь Аўсянікаў.

Канцэрт-закрыццё будзе прысвечаны Уладзіміру Мулявіну. У ім прымуць удзел ансамбль «Песняры», а таксама Аляксей Хлястоў, Вікторыя Алешка, гурт «Чысты голас» і іншыя. Скончыцца ўсё вялікім феерверкам.

Пралогі святочнай дзеі аздобіць музыка гуртоў «Стары Ольса», Shuma, Navi і іншых.

Як распавёў Павел Каранеўскі, на сцэне будзе ўстаноўлена вялізнае люстэрка, даўжынёй у 42 метры, аздобленае нацыянальнымі арнаментамі. Экраны, сеткі — усё будзе змяняцца і мільгацець. Напярэдадні былі сабраны ўзоры колераў, вышывак Рагачоўшчыны, каб менавіта яны ўпрыгожвалі галоўны экран.

Запіс адкрыцця можна будзе ўбачыць па тэлебачанні ў нядзелю ў 20.30. Паказ уручэння Нацыянальнай літаратурнай прэміі і канцэрта закрыцця адбудзецца ў панядзелак увечары.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
nina@zviazda.by

■ Выбары-2016

КАБ РАЗГЛЕДЗЕЦЬ СВАЙГО КАНДЫДАТА

У гэтым дапамогуць павелічальнае шкло і спецыяльны трафарэт. Трэнінгі з удзелам членаў выбарчых камісій мадэліруюць сітуацыі пры галасаванні

Для людзей з абмежаванымі магчымасцямі на ўчастках для галасавання ствараюцца неабходныя ўмовы. Пра гэта паведаміў старшыня Гомельскай абласной выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання Мікалай СТОШ.

— У прыватнасці, для тых, хто не бачыць, будуць прапанаваны спецыяльныя трафарэты, якія дапамогуць такім людзям ажыццявіць свой выбар самастойна і без памылак. Для тых, хто дрэнна бачыць, прапануем павелічальнае шкло. Дарэчы, сітуацыі, як правільна дапамагчы людзям з абмежаванымі магчымасцямі, прайграюцца на спецыяльных трэнінгах, у якіх удзельнічаюць члены ўчастковых выбарчых камісій. Мадэліруюцца розныя варыянты паводзінаў. Напрыклад, што рабіць у дзень выбараў ці на датэрміновым галасавнні з людзьмі, якія не пражываюць на гэтай тэрыторыі ці паводзяць сябе неадэкватна. Абмяркоўваем сітуацыі, якія могуць узнікнуць пры стасунках з прадстаўнікамі СМІ ці міжнароднымі назіральнікамі. І, канешне, нагадваем пра выкананне выбарчага заканадаўства.

У Гомельскай вобласці створана 1038 участкаў для галасавання на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання. Участковыя выбарчыя камісіі ўжо прыступілі да дзяжурства. На кожным участку для галасавання знаходзяцца спісы выбаршчыкаў. Кожны загадзя можа праверыць, ці ёсць яго прозвішча ў гэтым спісе. Акрамя таго, на выбарчых участках змешчаны звесткі пра кандыдатаў у дэпутаты. З біяграфіямі патэнцыяльных народных выбраннікаў таксама можна азнаёміцца.

— Акруговыя камісіі завяршылі друкаванне бюлетэняў для галасавання і запрашэнняў на выбары, — адзначае Мікалай Стош. — Перыяд агітацыі працягваецца. Аднак не ўсе кандыдаты актыўна ўключыліся ў гэты працэс — 16 з 67 кандыдатаў увогуле не маюць давераных асоб. Толькі 39 стварылі ўласныя выбарчыя фонды. Частка прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат адмовілася ад бясплатнага выступлення ў эфіры па тэлебачанні і радыё. Вядома, улічваючы гэтыя факты, эфектыўнасць правядзення агітацыйных мерапрыемстваў змяншаецца. Празрыстых урнаў на гэтых выбарах стане некалькі больш (на папярэдніх выбарах на Гомельшчыне празрыстай была кожная дзясятая скрыня). Але ж гэта будзе залежаць ад фінансавых магчымасцяў на месцах.

Акрамя таго, Мікалай Стош акцэнтаваў увагу на грамадзянскім абавязку выбаршчыкаў, ад актыўнасці якіх на выбарах залежыць будучыня нашай краіны:

— Галоўная задача парламентарыяў — распрацоўка і прыняцце законаў, па якіх наша краіна будзе эфектыўна працаваць. Таму хацелася б, каб усе выбаршчыкі выявілі актыўную грамадзянскую пазіцыю і прагаласавалі на карысць таго ці іншага кандыдата. Аддайце свой голас за будучыню нашай краіны.

Дададзім, што на Гомельшчыне зараз права голасу на парламенцкіх выбарах маюць больш за 1 мільён 100 тысяч чалавек.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■

ПРАЕКТ ДРУЖБЫ І ПАРАЗУМЕННЯ

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі 3 верасня пройдзе міжнародны «круглы стол» айчынных і замежных пісьменнікаў «Сугучча: слова Скарыны ў сучасным свеце»

Удзел у абмеркаванні актуальных праблем прысутнасці мастацкага слова ў свеце, судакранання традыцый і часу ў прыгожым пісьменстве прымуць літаратары больш як з 10 краін свету. Кітай, Расія, Азербайджан, Таджыкістан, Казахстан, Сербія, Літва, Латвія — прадстаўнікі гэтых і іншых дзяржаў выкладуць свой светапогляд на стан духоўных каштоўнасцяў, маральных асноў у фарміраванні канслідаванага грамадства, выхаванні чытача з памкненнямі да міралюбства і ўзаемапаразумення.

Прадметам размовы, несумненна, стане і сітуацыя з мастацкім перакладам, прысутнасцю іншых нацыянальных літаратур у Беларусі на беларускай і рускай мовах. Міністэрствам інфармацыі нашай краіны даволі шмат зроблена дзеля падтрымкі перакладчыцкіх памкненняў беларускіх паэтаў і празаікаў. Толькі апошнім часам у Мінску пабачылі свет кнігі паэтаў і празаікаў Таджыкістана, Азербайджана, Туркменістана, Чарнагорыі, Сербіі, Кітая, Казахстана, Расіі, Украіны... У Выдавецкім доме «Звязда» закладзены асновы некалькіх кніжных серый: «Светлыя знакі. Паэты Кітая», «Сябрына: паэзія народаў Расіі», «Сяброўства без межаў». У кожнай з іх пабачылі свет кнігі як аўтарытэтных мастакоў слова, якія сёння працуюць у літаратуры, так і класікаў, — народнага паэта Удмурціі Вячаслава Ар-Сяргі, туркменскага шахіра Касыма Нурбадава, паэтаў Кітая Лі Бо, Ду Фу, Ван Вэя, Ай Ціна, Лі Хэ, Лі Цінчжаа. Таксама выходзіць альманах перакладной літаратуры «Сугучча» — ужо пабачылі свет тры выпускі.

Сяргей ШЫЧКО.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

1000-гадовы юбілей Брэста сустрэць годна

25 жніўня Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка падпісаў распараджэнне «Аб падрыхтоўцы да святкавання 1000-годдзя г. Брэста».

Менавіта гэтым распараджэннем прадугледжана ўтварэнне рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання юбілею Брэста. Аргкамітэт узначаліла віцэ-прэм'ер краіны Наталля Качанава. Намеснікам старшыні камітэта прызначаны старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр Рагачук.

Кіраўніком дзяржавы зацверджаны план падрыхтоўкі. Дакумент уключае ў сябе вялікую колькасць мерапрыемстваў, накіраваных на рэканструкцыю і захаванне гісторыка-культурных аб'ектаў. Запланавана таксама будаўніцтва аб'ектаў сацыяльнага і культурна-асветніцкага прызначэння, удасканаленне гарадской інфраструктуры.

Як паведаміў карэспандэнту газеты начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі гарвыканкама Генадзь Іванчын, цяпер дакументы дэталёва прапрацоўваюцца ў гарвыканкаме з тым, каб вызначыць парадак дзеянняў мясцовай выканаўчай улады.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Рабочыя месцы і сацыяльныя задачы

У некалькіх раёнах Гродзеншчыны плануецца ажыццявіць пілотны праект ААН па сацыяльным прадпрымальніцтве.

Гэтую тэму **прадстаўнік Праграмы развіцця ААН у Беларусі Санака САМАРАСІНХА** абмеркаваў падчас візіту ў горад над Нёманам са **старшынёй Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам КРАЎЦОВЫМ**. Праектам прадугледжана стварыць невялікія прадпрыемствы з сацыяльнай функцыяй, напрыклад, у сферы адукацыі, аховы здароўя, падтрымкі пажылых людзей.

— Мы пастаянна вырашаем пытанні занятасці насельніцтва і заўсёды гатовы пераняць вопыт, убачыць новыя магчымасці вырашэння падобных праблем, — падтрымаў ідэю праекта Уладзімір Краўцоў.

У партнёрстве з Праграмай развіцця ААН у Гродне цяпер будуецца энергаэфектыўны жылы дом новага пакалення, а таксама плануецца рэалізаваць адукацыйны праект для дзяржслужачых і праект «Белмед», скіраваны на здаровы лад жыцця і прафілактыку неінфекцыйных захворванняў. Акрамя таго, Гродна і Ліда будуць сярод дванаццаці гарадоў нашай краіны, дзе ў кастрычніку — снежні сёлетняга года пройдзе кампанія ААН «Інклюзіўная Беларусь». У яе рамках адбудуцца канферэнцыі, выставы, тэатральныя пастаноўкі, музычныя і іншыя імпрэзы, скіраваныя на ўключэнне ў жыццё грамадства так званых уразлівых груп насельніцтва (мігрантаў, бежанцаў, людзей з абмежаванымі магчымасцямі, ахвяр дамашняга гвалту і гандлю людзьмі), устараненне існуючых бар'ераў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Выратавальны гук у Соснах

За суткі апавяшчальнікі выратавалі шасцярых чалавек. У Любанскім раёне дзякуючы спрацоўцы аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка гібелі ў агні пазбегла сям'я з пяці чалавек.

Сігнал пра пажар у жылым доме ў пасёлку Сосны ратаўнікі атрымалі позна ўначы: гадзіннік паказваў палову чацвёртай гадзіны. Калі першае падраздзяленне МНС, размешчанае ў самім населеным пункце, прыбыло да месца выкліку, мясцовыя жыхары самастойна ліквідавалі агонь. Прачнуўшыся ад гуку прыбора, сям'я пакінула дом. Апроч бацькоў і іх дачкі-шасцікласніцы, у ім пражывалі старэйшая дачка ўладальнікаў жылля з дзіцем. Мяркуецца, што прычынай пажару стала парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання.

У гэты дзень прыбор своечасова папярэдзіў аб загаранні ў доме, які выкарыстоўваўся пад лецішча, пенсіянерцы з Магілёва. Жанчына адпачывала, калі спрацаваў апавяшчальнік. Магіляўчанка пакінула дом, які гарэў.

Па звестках Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, з пачатку года дзякуючы спрацоўкам аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў выратавана 70 чалавек, з іх 13 дзяцей.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГАЛОЎНЫ ЎРОК

«Нам мір завешчана берагчы!» — менавіта пад такой назвай ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі пройдзе першы ўрок у Дзень ведаў. За школьныя парты ў новым навучальным годзе ў Беларусі сядуць 110 тысяч першакласнікаў. У падарунак яны традыцыйна атрымаюць кнігу ад Прэзідэнта «Беларусь — наша Радзіма» з абноўленым мультымедыйным дадаткам.

Усяго ва ўстановах адукацыі ўсіх узроўняў у 2016/2017 навучальным годзе будуць вучыцца каля 2 мільёнаў дзяцей, школьнікаў, навучэнцаў, студэнтаў і слухачоў. У школы і гімназіі прыйдуць больш як 982 тысячы хлопчыкаў і дзяўчатак.

У новым навучальным годзе ў краіне будуць функцыянаваць 3 167 установаў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку 210 гімназій. У ходзе аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі сёлета было закрыта 67 школ і 80 навучальных устаноў рэарганізавана. Разам з тым 1 верасня для вучняў расчыняць свае дзверы і дзве новыя ўстановы адукацыі: вучэбна-педагагічны комплекс «Дзіцячы сад — пачатковая школа» на 471 месца (з іх 150 месцаў для дашкольнікаў) у Брэсце і сярэдняя школа на 510 месцаў у курортным пасёлку Нарач.

Ва ўстановах адукацыі будуць працаваць у новым навучальным годзе больш за 220 тысяч педагогаў, з якіх звыш 5,4 тысячы — гэта маладыя спецыялісты.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Першы званок

Лілія АНАНІЧ:

«Кожны можа стаць высокаадукаваным і паспяховым»

Прыгожая новая школьная форма, яркія пышныя букеты, расчуленыя бацькі і ўсхваляваныя дзеці — па ўсёй краіне ўчора прайшлі ўрачыстыя лінейкі, прысвечаныя пачатку новага навучальнага года. У сталіцы сёлета за парты сядуць больш за 185 тысяч вучняў, сярод іх — 21 тысяча першакласнікаў. На трох мовах сёння віталі і ажыўленых пачаткоўцаў, і засяроджаных выпускнікоў падчас святочнай лінейкі ў сталічнай гімназіі №32.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Акрамя дзвюх дзяржаўных моў — рускай і беларускай — мова міжнародных зносін, англійская, была выбрана нездарма. Гімназія славіцца высокім узроўнем выкладання гэтага прадмета. Для бацькоў многіх першакласнікаў менавіта моўны ўхіл стаў вырашальным фактарам у выбары навучальнай установы. Пасля 9-га класа вучні ўжо самі выбіраюць профіль: фізіка-матэматычны або філалагічны.

З пачаткам новага навучальнага года гімназістаў павіншавала **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**

— Сёння ў Беларусі цудоўны мірны дзень, — сказала яна. — Тысячы і тысячы дзяўчат і хлопцаў — хто зноў, а хто і ў першыню — пераступаюць парогі школ, каб разам з настаўнікамі пры падтрымцы сваіх бацькоў, атрымаць фундаментальныя веды і стаць адказнымі грамадзянамі рэспублікі, патрыётамі сваёй краіны. У нашай дзяржаве робіцца ўсё магчымае, каб кожны малады чалавек мог стаць высокаадукаваным і, калі казаць сучаснай мовай, паспяховым.

Звяртаючыся да педагогаў, міністр адзначыла, што яны з пакалення ў пакаленне сумленна ўкладаюць у нашых дзяцей сэрцы і душы, не толькі дзелячыся з імі сваімі ведамі, але і дапамагаючы ўздымацца па першых жыццёвых прыступках.

А вось для выпускнікоў гэта фінальны год. «Галоўнае — не толькі марыць аб вялікай будучыні, але і на справе падтрымліваць высокую планку», — сказала Лілія Ананіч.

Паводле яе слоў, у нашай краіне маюцца ўсе ўмовы, каб кожны новы навучальны год пачынаўся прыгожа і быў паўнавартасным. «Нашы дзеці, — сказала Лілія Станіславаўна, — прыгожа апранутыя, упакаваныя іх заплечнікі — пастараліся беларускія прадпрыемствы. Падрыхтаваліся да гэтага і беларускія кнігавыдаўцы: яны забяспечылі выпуск падручнікаў для агульнаадукацыйных школ і для вышэйшых навучальных устаноў».

Міністр інфармацыі адзначыла таксама, што галоўны атрыбут адукацыйнага працэсу — друкаваная кніга, да таго ж у наступным годзе будзе святкавацца 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, таму бібліятэка гімназіі ў гонар свята папоўнілася кнігамі пра Францыска Скарыну — «Чалавек свету» і «Чалавек-энцыклапедыя».

Дар'я КАСКО.
kasko@zviazda.by

ПЛЁННА ВУЧЫЦЦА ДАПАМОЖА КАПРАМОНТ

Школы Рагачова падрыхтаваліся да Дзён ведаў і пісьменства

Сёння на Гомельшчыне за парты селі больш як 150 тысяч вучняў. У Рагачоўскім раёне, дзе праходзіць апошняя падрыхтоўка да Дня беларускай пісьменства, каля шасці тысяч дзяцей надзелі школьную форму. Для навучэнцаў сярэдняй школы №3 горада Рагачова Дзень ведаў сёлета асаблівы. Установа адукацыі была пабудавана паўстагоддзя таму і апошнім часам патрабавала капітальнага рамонту. У планах старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра Дворніка наведаць школу 1 верасня, каб ацаніць рамонт і натхніць вучняў на плённую працу.

Рэканструкцыя ў школе пачалася ў чэрвені. За тры месяцы, дзякуючы агульным намаганням будаўнікоў і валанцёраў школа і тэрыторыя навокал змяніліся да непазнавальнасці.

— Бралі ўдзел і бацькі, шчыры ім дзякуй, і дзеці, і валанцёры — як Жлобінскага раёна, так і нашага, — расказвае **дырэктар Ігар ЖДАНАЎ**.

На рамонт школы было выдзелена звыш 1 млн дэнамінаваных рублёў. За кошт гэтых сродкаў зроблены капітальны рамонт даху, фасада, добраўпарадкавана тэрыторыя з заменай асфальтавага пакрыцця, агароджы, спартпляцовак. У будынку заменены вокны, адрамантаваны навучальныя кабінеты, калідоры, набыты камп'ютарны клас з інтэрактыўнай дошкай і мэбля для вучняў. Сёлета тут за парты сядзе амаль 400 школьнікаў. Нядаўна сярод іх была і Соф'я Юрчанка (Міхейчык), якая цяпер — член зборнай Беларусі па веславанні на байдарках і каноэ. Яна сярэбраная прызёрка чэмпіянату Еўропы, пераможца сусветнай універсіяды ў Казані.

Змены закранулі і школу №2 у Рагачове. Тут галоўны акцэнт зроблены на рамонце кабінетаў, пераважна гаспадарчым спосабам. Да таго ж пераабсталявалі стадыён і прывялі ў парадак тэрыторыю. Дзеці, якія прыходзілі ў аздараўленчыя лагеры, не толькі ўдзельнічалі ў разнастайных забаўляльных мерапрыемствах, але і аказвалі актыўную дапамогу настаўнікам пры падрыхтоўцы да новага навучальнага года.

Прыведзены ў парадак і ўстановы ў сельскай мясцовасці. У Гарадзецкай дапаможнай школе-інтэрнаце на Рагачоўшчыне, дзе навучаецца і пражывае каля 100 дзяцей, якія апынуліся ў няпростай жыццёвай сітуацыі, рэалізаваны замежны праект. Як расказаў **дырэктар гарадзецкай дапаможнай школы-інтэрната Ігар ЧЫГУНКОЎ**, італьянскі фонд «Дапаможам ім жыць» аказаў спонсарскую дапамогу ўстанове больш як на 50 тысяч еўра:

— Італьянскія валанцёры працавалі два тыдні, за гэты час шмат чаго паспелі. Зрабілі нам асобны душавы пакой, што дазваляе адмовіцца ад паслуг лазні, куды мы раней вазілі дзяцей. У фінансавым плане гэта дапаможа сэканоміць за год больш за 100 мільёнаў рублёў. Цяпер дзеці будуць мыцца непасрэдна ў школе.

Дададзім, што на Гомельшчыне каля 27,5 тысячы школьнікаў са шматдзетных сем'яў атрымалі дапамогу да новага навучальнага года.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

Партфель для першакласніка і прэмія выдатніку

Першакласнікі, чые бацькі працуюць у трэсце «Гроднагарбуд», атрымалі ў падарунак партфелі.

Акрамя таго, прафсаюзны камітэт прадпрыемства закупіў для 50 дзяцей, якія сёлета ўпершыню сядуць за школьныя парты, поўны камплект канцылярскіх прылад — сшыткі, ручкі, алоўкі, пеналы і іншае.

А ў гродзенскай кампаніі «Малочны свет» ужо па добрай традыцыі ўзнагародзілі дзяцей работнікаў прадпрыемства за выдатную вучобу. Грашовыя прэміі атрымалі больш за сто выдатнікаў — школьнікі з Гродна, Скідзеля і Бераставіцы, а таксама студэнты вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. На свята з нагоды пачатку новага навучальнага года запрасілі і выхаванцаў Гродзенскага дзіцячага хоспіса, дзіцячага сацыяльнага прытулку, падшэфных прыёмных сем'яў. Усе ахвотныя разам з мастакамі-графіцістамі паўдзельнічалі ў роспісе двухсотметровай бетоннай сцяны на тэрыторыі прадпрыемства, і ў выніку атрымаўся арт-аб'ект з выявай малочных прадуктаў. Для гэтай акцыі прадпрыемства «Малочны свет» купіла больш за 100 балонаў з аэразольнай фарбай у кампаніі «ОБК», якая пералічыла выручаныя грошы на рахунак Гродзенскага дзіцячага хоспіса.

Барыс ПРАКОПЧЫК. *prakopchik@zviazda.by*

ПА НОВЫМ ПРАЕКЦЕ

У курортным пасёлку Нарач, што ў Мядзельскім раёне, 1 верасня гасцінна расчыніць дзверы новая школа на 510 месцаў, дзе будуць вучыцца дзеці з 1-га па 11-ты клас у адну змену.

У школе створаны ўсе ўмовы як для вучобы, так і для фізічнага развіцця школьнікаў. Тут прадугледжана спартыўная зала плошчай 540 квадратных метраў з пляцоўкамі для заняткаў рознымі відамі спорту, а таксама трэнажорная зала амаль на 100 квадратаў. Ёсць і актавая зала на 152 месцы з сучасным аснашчэннем, сцэнай. Акрамя таго, у новым будынку размясціліся кабінеты інфарматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі, майстэрні тэхнічнай абслуговай працы для хлопчыкаў і дзяўчатак. Уражвае і спартыўная вонкавая зона: вялікі стадыён, пляцоўкі для навучальнага працэсу і пазакласнай работы: геаграфічная, па вывучэнні правіл дарожнага руху. Яны выкананы з дапамогай сучаснага пакрыцця на аснове гумавай крошкі, у спалучэнні з газонамі, тратуарнай пліткай, асфальтам.

За аснову ўзяты праект, што рэалізаваны ў Астраўцы Гродзенскай вобласці. Але на Міншчыне яго цалкам адаптавалі да мясцовых умоў, да ўжо існуючай інжынернай інфраструктуры: водаправодных, электрычных, каналізацыйных, ацяпляльных сетак. Усё гэта дазволіла зрабіць кошт будаўніцтва больш танным. Гэты праект максімальна просты, але прадугледжвае ўсё неабходнае, каб якасна арганізаваць навучальна-выхаваўчы працэс у адну змену.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

Банк развіцця падорыць аўтобусы

Старшыня праўлення «Банка развіцця Рэспублікі Беларусь» Сяргей Румас перадасць 10 школьных аўтобусаў МАЗ мадэлі 241S30 упраўленню адукацыі Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта.

Перадача аўтобусаў пройдзе ў рамках праграмы, якая рэалізуецца банкам і прадугледжвае набыццё на працягу 2013—2017 гадоў не менш як 300 адзінак спецыяльна абсталяваных школьных аўтобусаў. Плануецца, што праграма дазволіць цалкам вырашыць праблему забеспячэння падвозу дзяцей у сельскай мясцовасці да месцаў навучання і назад.

Пасля заканчэння ўрачыстай цырымоніі адбудзецца прэзентацыя новай мадэлі школьнага аўтобуса МАЗ 257, а таксама наведванне лабараторыі, абсталяванай аргтэхнікай, якая была выкарыстана падчас распрацоўкі новай мадэлі. Спонсарская дапамога на закупку гэтай тэхнікі была аказана Банкам развіцця. Дарэчы, такім жа чынам летась была прадстаўлена ўдасканаленая мадэль аўтобусаў 241S30, на якой ужо ў гэтым годзе ў школу будуць ездзіць маленькія жыхары Магілёўшчыны.

Стварэнне новай мадэлі школьнага аўтобуса МАЗ 257 праводзілася з улікам водгукаў і пажаданняў арганізацый, якія непасрэдна карыстаюцца аўтобусамі. Адначасова на ім можна перавозіць да 28 школьнікаў. Кожнае месца абсталявана чатырохкропкавымі рамянямі бяспекі. Усе астатнія змены і ўдасканаленні канструкцыі новага школьнага аўтобуса дазволяць зрабіць рух па сельскіх дарогах больш бяспечным.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ПАДАРУНАК ДЛЯ САМЫХ МАЛЕНЬКІХ

Вялікім падарункам для жыхароў сталічнага мікрараёна Каменная Горка-3 стала адкрыццё ў канцы жніўня новага дзіцячага садка №285.

Дашкольная ўстанова размяшчаецца па адрасе: вул. Каменагорская, 106. Садок абсталяваны ўсім неабходным для камфортнага знаходжання і развіцця дашкольнікаў. У новай навучальнай установе ёсць спартыўная і трэнажорная залы, басейн, універсальная прастора для заняткаў эстэтычнай накіраванасці. Дзеці таксама змогуць добра запомніць правілы дарожнага руху — на тэрыторыі ёсць спецыяльная пляцоўка для іх вывучэння. Садок гатовы прыняць 230 хлопчыкаў і дзяўчынак.

Новая школа таксама павінна ў хуткім часе з'явіцца ў сталічным мікрараёне Масюкоўшчына — яе здача запланавана на наступны каляндарны год.

Сёлета ў Мінску былі праведзены работы па капрамонце будынкаў 12 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у 8 з іх быў комплексны капрамонт.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

■ Наўздагон

Прыцэл на 2020

Бразільскія ўрокі дапамогуць лепш падрыхтавацца да наступных Алімпійскіх гульняў у Токіа

Першы намеснік міністра спорту і турызму краіны, шэф беларускай дэлегацыі ў Бразіліі Аляксандр ГАГІЕЎ падвёў вынікі выступлення нашых спартсменаў у Рыа-дэ-Жанейра. Як і большасць спартыўных чыноўнікаў, ён выказаў думку, што беларуская зборная нядрэнна паказала сябе на галоўных стартах чатырохгоддзя.

— Напярэдадні Гульняў мы вырашылі ўсе пытанні па забеспячэнні нацыянальных камандаў. І самааддача, якую прадэманстравалі спартсмены, сведчыць сама за сябе. Усе ставілі максімальныя задачы. Разам з тым маем тое, што маем — 9 медалёў. Магчыма, не тая колькасць, якую хацелася б, але ў цэлым выступілі годна, — сказаў ён.

Першы намеснік міністра падкрэсліў, што па выніках Алімпіяды кожны трэці беларускі атлет аказаўся ў васьмёрцы наймацнейшых. Вельмі парадавалі прадстаўнікі вольнай і грэка-рымскай барацьбы. Атлеты ў гэтых відах выйгралі медалі, якія не ўдалося ўзяць у Лондане, дзе было адразу некалькі пятых месцаў. Таксама Аляксандр Гагіеў не абышоў увагай выступленне жаночай баскетбольнай каманды.

— Дзяўчаты, на мой погляд, выступілі годна: трапіць у гульнявых відах спорту на Алімпіяду, аказацца ў ліку 12 найлепшых у свеце — ужо вялікае дасягненне.

Таксама Гагіеў падкрэсліў, што, нягледзячы на бытавыя складанасці ў Бразіліі, пра якія ўжо гаварылася шмат, і дзякуючы дысцыпліне ў алімпійскай камандзе, у Рыа абышлося без асаблівых здарэнняў, якіх не ўдалося пазбегнуць іншым зборным.

Першы намеснік міністра Аляксандр Славіевіч адзначыў, што медальны вынік мог быць і лепшым, але негатыўныя фактары, якія паўплывалі на каманду перад самым ад'ездам на Алімпіяду, перашкодзілі заваяваць большую колькасць узнагарод. Асноўнымі прычынамі сталі адхіленне нашых спартсменаў з прычыны допінгавых скандалаў. Працэс абароны айчынных атлетаў працягваецца і сёння. У Міжнародным спартыўным судзе ў Лазане знаходзяцца два іскі беларускага боку. Першы тычыцца адхілення ад летняй Алімпіяды мужчынскай каманды канаістаў, другі іск — з нагоды цяжкаатлетаў. Чакаецца, што гэтыя пытанні будуць разгледжаны ў верасні-кастрычніку.

Яшчэ адзін скандал спасціг нашага таэквандыста ўжо падчас Алімпіяды. Напярэдадні вылету ў Рыа-дэ-Жанейра ў Армана-Маршала Сілы ў арганізме быў выяўлены забаронены прэпарат — мельдоній.

— Падрабязнасцяў паведамляць не хачу, дэталяў пакуль няма. Ідзе расследаванне, якое праводзіцца Нацыянальным антыдопінгавым агенцтвам, кампетэнтныя органы таксама гэтым пытаннем займаюцца. Гэта быў чарговы ўдар нам у спіну — ці то з боку міжнародных арганізацый, а можа, нават і ад сваіх. Нікога не хачу пакуль вінаваціць, рэзкія заявы рабіць не буду. Нават калі гэта здарылася па халатнасці, нават калі хтосьці яму рэчыва гэтае падліў, абвінавачванні з атлета не здымаюцца. Прычым такой вялікай канцэнтрацыі мельдонію, якая зафіксавана ў Армана, не было ні ў кога з усёй каманды, — распавёў Аляксандр Гагіеў.

Яшчэ адно праблемнае пытанне, пра якое казаў Аляксандр Славіевіч, датычыцца відаў спорту, якія ў краіне страчваюць свае пазіцыі — плаванне і лёгкая атлетыка. На яго думку, праблемы тут у тым, што спартсмены не змаглі выйсці на пік формы, але больш дэталёвы разбор яшчэ трэба будзе зрабіць кожнай федэрацыі асобна.

На прыкладзе спартыўнай гімнастыкі закранулі праблему не заўсёды апраўданай і ўдалай натуралізацыі спартсменаў. Гімнастка з ЗША Кайлі Дыксан, якая на Алімпійскіх гульнях прадстаўляла нашу краіну, заняла толькі перадапошняе месца.

— Амерыканка выступіла не зусім удала. Але яна прыехала ў Рыа з траўмай. Прычым сама пра яе не ведала. Ужо на месцы нашы лекары заўважылі нядобрае, паколькі спартсменка скардзілася на дыскамфорт. Зрабілі МРТ. Выявілі расколіну ў ступні. Чакаць ад яе выступлення чагосьці звышнатуральнага было складана, але хацелася б большага, чым перадапошняе месца.

Мы ўжо зрабілі высновы. Першапачаткова, магчыма, пайшлі на повадзе ў людзей, якія прапаноўвалі натуралізацыю, з улікам нашай безвыхаднасці ў спартыўнай гімнастыцы. Стаўка рабілася на тое, што гэтыя дзве амерыканскія спартсменкі дапамогуць нашым падцягнуцца, стаць больш упэўненымі. Цяпер разумеем, што, напэўна, памыліліся. У будучыні будзем больш педантычна падыходзіць да такіх пытанняў. Кантраляваць, каб хоць заключныя этапы падрыхтоўкі прывезеныя спартсмены праводзілі ў Беларусі, — сказаў Аляксандр Гагіеў.

Нагадаем, беларуская зборная на сёлетніх Алімпійскіх гульнях заваявала 9 узнагарод і заняла 40-е месца ў агульнамедальным заліку.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. *lobazhevich@zviazda.by*

Суцэльная хваля «шэрых» агентаў

Ад дэмпінгу да махлярства — адзін крок

Спецыялісты рынку жыллёвай нерухомасці паведамляюць, што сёння кожны трэці «шэры» агент дзейнічае без ведама ўладальнікаў кватэр, бо збірае інфармацыю з адкрытых крыніц, пасля чаго размяшчае аб'явы з указаннем асабістых кантактаў. Многія агенты-адзіночкі працуюць з уласнікамі наўпрост, а каб заручыцца іх падтрымкай, актыўна звяртаюцца да свабоднага цэнаўтварэння (у адрозненне ад рыэлтарскіх арганізацый, яны могуць выкарыстоўваць любыя тарыфы). У выніку даходзіць да абсурду, калі адзін і той жа чалавек прадае 15-20 кватэр. Тут трэба адзначыць, што падобныя спецыялісты-індывідуалы не страхуюць правядзенне сваіх здзелак ад форс-мажорных выпадкаў, а таксама яны не плацяць адпаведныя падаткі і зборы ў дзяржаўную казну.

Наш эксперт прагназуе, што ў найбліжэйшай будучыні мінчане і ўвогуле могуць сутыкнуцца з засіллем нелегальных пасярэднікаў, а «шэрых» агентаў пачнуць змяняць «чорныя рыэлтары» — тыя, што выкарыстоўваюць заведама ашуканскія схемы. «Калі сітуацыя не зменіцца, то не выключана, што мы можам сутыкнуцца з негатыўным вопытам расійскіх гарадоў, у якіх квітнеюць «чорныя маклеры», а тэма жылля не пакідае крымінальных зводак. Пакуль, вядома, сітуацыя ў Беларусі далёкая ад крытычнай, але тэндэнцыя насцярожвае», — патлумачыў сваю пазіцыю Мікалай Прасталупаў.

Падобныя спецыялісты-індывідуалы не страхуюць правядзенне сваіх здзелак ад форс-мажорных выпадкаў, а таксама яны не плацяць адпаведныя падаткі і зборы ў дзяржаўную казну.

Шанц «адбяліць» рынак

Выправіць сітуацыю на другасным рынку жылля эксперт прапануе без нейкіх жорсткіх метадаў, а выключна звычайным чынам: патрабаваць ад аўтара аб'явы аб продажы нерухомасці пацвярджэння, што ён з'яўляецца ўласнікам жылля або атрымаў ад апошняга даверанасць на продаж кватэры. Акрамя таго, да агентаў-адзіночак павінны прад'яўляцца тыя ж патрабаванні, што і да рыэлтарскіх арганізацый. «Пакуль тут няма раўнавагі. Чым большы ціск аказваюць на легальны сектар, тым хутчэй расце ценявы. Так працуе эканоміка ў любой краіне свету», — падкрэслівае спецыяліст.

Паводле яго слоў, рыэлтарскія арганізацыі, у адрозненне ад вольных агентаў, за кожнае дзеянне адказваюць рублём, а ў выпадку чаго могуць пазбавіцца ліцэнзіі і пакінуць рынак. «Афіцыйнаму агенцтву нерухомасці ёсць што губляць: ад таго, наколькі прафесійна яно працуе з кліентам, залежыць яго лёс на рынку. Тым самым спажывец атрымлівае пэўныя гарантыі і можа быць упэўнены ў якасці працы. А вось пры супрацоўніцтве з «шэрым» маклерам чалавек можа разлічваць толькі на ўдачу», — лічыць спадар Прасталупаў.

Спецыялісты арганізацый асацыяцыі ўпэўнены, што «шэрыя» пасярэднікі могуць падарваць давер у кліентаў да рынку жылля. «Калі чалавек сутыкнуўся з нядбайным агентам-адзіночкай, у яго складваецца лжывае ўяўленне аб усіх удзельніках рынку жылля. Такіх выпадкаў усё больш, і ад іх, у канчатковым выніку, могуць пацярпець і тыя, хто працуе прафесійна і адказна», — адзначыў старшыня савета.

«Улетку было зафіксавана 1,3—1,4 тысячы здзелак у месяц, у 2016 годзе іх агульная колькасць можа дасягнуць 15 тысяч, што нашмат перавышае паказчыкі 2013-2014 гадоў, якія да гэтага часу лічыліся рэкорднымі».

Рэкорды актыўнасці

Мікалай Прасталупаў паведаміў, што айчынны рынак жылой нерухомасці, пачынаючы з лета, істотна ажывіўся, і па выніках года можа быць зарэгістравана рэкордная колькасць здзелак, аднак цэны працягнуць зніжацца і ў наступныя месяцы.

Цяпер на рынку назіраецца цікавая сітуацыя, калі спецыялісты сутыкнуліся з небывалай колькасцю здзелак. «Улетку іх было зафіксавана 1,3—1,4 тысячы ў месяц, і ў жніўні сёлета рост працягваўся», — паведаміў кіраўнік асацыяцыі. Больш за тое, на яго думку, у 2016 годзе агульная колькасць здзелак можа дасягнуць 15 тысяч, што нашмат перавышае паказчыкі 2013-2014 гадоў, якія да гэтага часу лічыліся рэкорднымі.

Эксперт таксама канстатаваў, што ў апошнія месяцы запаволілася і тэндэнцыя да зніжэння цэн на жыллё. «Цяпер можна чакаць такога зніжэння тэмпаў у памеры каля 1% у месяц, і я думаю, што да новага года будзе такая сітуацыя», — дадаў ён. Паводле яго слоў, не варта чакаць росту цэн і на рынку новабудоўляў. Сёння на першасным рынку жылля забудоўшчыкі спыніліся на цэнніку ў тысячу долараў за квадратны метр, што лічыцца мінімальнай гранічнай мяжой. «Сітуацыя магла б змяніцца, калі б было больш участкаў, але іх няма», — сказаў Прасталупаў. Ён падкрэсліў, што адсутнасць дастатковай прапановы на першасным рынку жылля будзе «вялікім тормазам» для істотнага далейшага зніжэння коштаў на кватэры на другасным рынку Мінска.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Факт

Ліда зноў стала «статысячнікам»

Гэты статус быў страчаны горадам у 2003 годзе, калі колькасць насельніцтва склала 99 810 чалавек.

А на 1 студзеня сёлетняга года ў райцэнтры, згодна з інфармацыяй аддзела статыстыкі Лідскага раёна, зарэгістраваны 100 443 жыхары. Вось як гэтая лічба выглядае ў параўнанні з апошнімі гадамі: у 2012-м гараджан было 98 744, у 2013-м — 99 430, у 2014-м — 99 928, у 2015-м — 99 976.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

З пасткамі — на норку

З 1 верасня ў краіне пачаўся сезон палявання на амерыканскую норку і андатру.

Асаблівасць сезона, які будзе доўжыцца да 31 сакавіка, — бязброевы спосаб здабычы дзічыны. Паляваць можна на жывёл любога полу і ўзросту пры дапамозе капканаў №0-3 і пастак (акрамя сілаў). Здабываць амерыканскую норку і андатру зброевым спосабам будзе дазволена з пачаткам масавага палявання на пушную дзічыну — з першай суботы лістапада і па апошнюю нядзелю студзеня ў светлы час сутак.

Б'юцца маршруткі...

На вуліцы Солтыса ў сталіцы маршрутнае таксі ўрэзалася ў слуп. Мікрааўтобус сутыкнуўся з аўтамабілем «Рэно», што разварочваўся на скрыжаванні, і ад удару яго адкінула на слуп. З 15 пасажыраў пацярпелі шэсць. Ад шпіталізацыі яны адмовіліся з прычыны лёгкіх траўмаў.

Літаральна ж днямі ў аварыі на 15-м кіламетры Магілёўскай шашы пацярпелі восем чалавек, калі маршрутка Старыя Дарогі — Мінск сутыкнулася з грузавіком. Усяго ў транспартным сродку знаходзіліся 17 чалавек. Па звестках Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС, кіроўца 1979 года нараджэння быў дэблакіраваны ратаўнікамі пры дапамозе гідраўлічнага інструмента. Яго шпіталізавалі ў Мінскую абласную клінічную бальніцу з меркаваным дыягназам «адкрыты пералом левай малой галёначнай косці і ўдарам ніжняй губы». Чатыры чалавекі з ліку пасажыраў з ударамі лёгкай ступені накіравалі ў гэтую ж медустанову для агляду, яшчэ аднаго даставілі ў 10-ю гарадскую клінічную бальніцу. Два пасажыры адмовіліся ад шпіталізацыі, дапамогу ім аказалі на месцы.

Сяргей РАСОЛЬКА

Выхадцы з Каўказа пакінулі лагер на беларуска-польскай мяжы

Чачэнцы і дагестанцы цэлымі сем'ямі жывуць у Брэсце недзе з канца вясны. Яны прыязджаюць у горад, здымаюць кватэры альбо засяляюцца ў гасцініцы. Кожны дзень людзі сядаюць у цягнік Брэст — Цярэспаль і едуць у Польшчу. Вечарам абсалютная большасць вяртаецца назад. Грамадзяне суседняй дзяржавы не стамляюцца рабіць спробы атрымаць статус бежанца, трапіць у спецыяльны лагер, а потым растварыцца ў Еўрасаюзе. Як правіла, штодзень такую магчымасць атрымліваюць ад пяці да пятнаццаці чалавек. Астатнія вяртаюцца ў Брэст і назаўтра пачынаюць зноў.

Паводле нашых законаў, грамадзяне Расіі могуць знаходзіцца ў нас да 90 дзён без рэгістрацыі. Вось і жывуць, пакуль хапае грошай на пражыванне ды старонак у пашпарце для памежных адзнак. І пакуль ёсць надзея, якую падтрымлівае прыклад тых пяці альбо пятнаццаці, якім шанцуе застацца.

...У нейкі момант градус напружання ў асяродку прыезджых вырас настолькі, што грамадзяне арганізаваліся і ўтварылі стыхійны лагер каля аўтамабільнага пункта пропуску «Брэст». Людзі пачалі збірацца там перад абедам 29 жніўня. Жанчыны з дзецьмі размяшчаліся на коўдрах і посцілках. Мужчыны сядзелі побач. Такім чынам яны хацелі прыцягнуць увагу польскага боку ды і грамадскасці наогул да іх праблем, спадзяваліся сустрэцца з прадстаўніком польскага консульства. Адным словам, ноч на зямлі правялі каля дзвюх соцень чалавек, у іх ліку былі нават дзеці ва ўзросце да года.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **кіраўнік прэс-службы Брэсцкай памежнай групы Аляксандр КІСЛОЎ**, 30-га ўвечары грамадзяне стыхійны лагер пакінулі. Прычыну такога рашэння патэнцыяльных бежанцаў у памежным ведамстве назваць не змаглі, толькі адзначылі, што з іх боку не зафіксавана якіх-небудзь парушэнняў заканадаўства альбо грамадскага парадку. Ён таксама пацвердзіў факт, што ўсе гэтыя людзі шмат разоў спрабавалі перасячы мяжу, але беспаспяхова.

Аляксандр Кіслоў дадаў, што ў апошнія дні адзначаецца значны спад патоку бязвізавых мігрантаў. Калі на пачатку месяца штодзень выязджала 700-800 чалавек, то цяпер на цярэспальскія цягнікі бяруць білеты 300-350 чалавек за дзень у спадзяванні на станоўчае вырашэнне хадайніцтва аб атрыманні статусу бежанца.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

1 ВЕРАСНЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15800)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

The Silicon:

Танцы, сонца, рок-н-рол з беларускім акцэнтам

У Беларусі існуе гурт, які выконвае ўласныя кампазіцыі ў рэдкім стылі сёрф-рока. Гэтая музыка першапачаткова ствараласа для курортнікаў і сёрфераў на каліфарнійскіх пляжах, але паступова развілася ў асобны стыль. Мелодыі з бесклапотнымі і паўдзённымі адценнямі вось ужо дзесяць гадоў іграе гурт The Silicon. Каманда доўгі час была фактычна адзінай прадстаўніцай сёрфу ў нашай краіне. The Silicon — гэта ўдарнік Ігар Сухарукаў, бас-гітарыст Канстанцін Калеснікаў і гітарыст Дзмітрый Паплаўскі. З Дзмітрыем мы і гутарым пра адметнасці стылю, чысціню жанру, рэакцыю беларускай публікі на такую рэдкую музыку і канкурэнцыю з калегамі.

— Дзіма, сёрф у нашай краіне — сапраўдная экзотыка. Як бы ты яго коратка апісаў?

— У ім часта адсутнічае вакал, гітара гучыць з асаблівым эфектам, які нагадвае шум прыбоя. Мелодыя пастаянна паўтараецца ў пэўнай варыяцыі — нібыта хваля адкацілася і зноў накацілася на бераг. Ёсць дакладны рытм, ад якога, як той казаў, ногі самі танчаць. Сёрф-рок зарадзіўся і развіўся ў Каліфорніі ў канцы 1950-60-х гадоў, а каралём стылю лічыцца гітарыст Дзік Дэйл, які, дарэчы, мае беларускія карані. Новую хвалю папулярнасці стыль перажыў у 1990-я, у многім дзякуючы легендарнаму фільму Квенціна Таранціна «Крымінальнае чытво». Сюжэт стужкі да сёрфа не мае ніякага дачынення, аднак па ўдалай задумцы рэжысёра ў ёй гучыць некалькі залатых хітоў жанру.

— Ці часта даводзіцца слухачам тлумачыць гэтыя адметнасці?

— Так, таму нас і ведаюць як выканаўцаў музыкі ў стылі фільмаў Квенціна Таранціна. Раней мы былі адзіным у Беларусі сёрф-рок-гуртом. Але ўжо з'явілася некалькі камандаў, якія таксама іграюць нешта падобнае. Наш бас-гітарыст Косця Калеснікаў стварыў уласны праект. Цікава, што ў Мінску сёрф-рок пачалі іграць яшчэ ў савецкія часы. Тут існаваў гурт «Алгарытмы», а ў 1968 годзе праходзіў фестываль біт-ансамбляў, падчас якога гучаў і сёрф.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Усё атрымаецца!

Як стаць сапраўдным студэнтам?

Парады першакурснікам

Фота Надзеі БУЖАН.

Я студэнтка. Новы калектыў, выкладчыкі, само жыццё... І яно не падобна на тое, да якога я прывыкла за адзінаццаць гадоў вучобы ў школе... Закончыўся ўжо год навучання. Цяпер нас па праве можна назваць сапраўднымі студэнтамі! Гэта мы на першай лінейцы не ведалі, як выглядаюць будучыя аднагрупнікі і як завуць куратара, гэта мы блукалі па калідорах у пошуках патрэбнай аўдыторыі, гэта мы не ўяўлялі, што такое сесія, але ўжо загадзя яе баяліся. І вось першы год нашага студэнцтва падышоў да канца. Даўся ён нялёгка — прыйшлося прывыкнуць да новага рытму, асвоіцца, бо замест урокаў — пары, замест настаўнікаў — выкладчыкі, ды і сістэма ацэньвання адрозніваецца ад школьнай. Шмат што змянілася за гэты год. Колькі новых і цікавых рэчаў я спазнала, з колькімі незвычайнымі людзьмі пазнаёмілася, колькі месцаў наведала і чаму толькі не навучылася!

ГАЛОЎНАЕ — МЕЦЬ ЖАДАННЕ

— Вялікі горад — больш магчымасцяў, — расказвае студэнтка другога курса факультэта міжнародных адносін БДУ (спецыяльнасць «Лінгвакраіназнаўства») Настасся Пуцілі-на. — Я стараюся не ўпускаць нічога: хаджу на розныя выставы, трэнінгі, майстар-класы, у тэатры. Вядома, не забываю і пра вучобу. Год таму я выбрала гэтую спецыяльнасць, таму што зацікавілася кітайскай мовай і культурай, і нікольк не шкадую аб сваім рашэнні. Вучыцца няпроста, але пры жаданні ўсё магчыма — і адпачыць, і добра здаць сесію.

Студэнцкае жыццё моцна адрозніваецца ад таго, да чаго я прывыкла: больш свабоды, але і больш адказнасці. Мне вельмі пашанцавала з асяроддзем, таму адаптацыя да новых умоў прайшла хутка. Са мной у групе вучыцца 29 чалавек (з іх толькі адзін хлопец). Памятаю, як 1 верасня ўсе стаялі на лінейцы і разглядалі адно аднаго: усе такія рознын, ніхто нікога не ведае. А цяпер мы ўжо адзін дружны калектыў і гэта выдатна. Спадзяюся, што праз пяць гадоў кожнага з аднагрупнікаў змагу назваць калегам і сябрам.

АДКАЗНАСЦЬ І ПРАЦА ШТОДНЯ

Студэнтка другога курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Паліна Хадорык адзначае, што першакурснікі хоць і адрозніваюцца ад школьнікаў, але і на бывалых студэнтаў яшчэ не падобныя.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

З «базай» у галаве

ЖЫЦЦЮ НАВУЧЫЦЬ... ІНФАРМАТЫКА

Дыскусіі пра карысць гэтага школьнага прадмета не сціхаюць

З 1 верасня 1985 года «Інфарматыка», а дакладней прадмет «Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі», стаў абавязковым ва ўсіх школах Савецкага Саюза. Вось толькі трыццаць гадоў таму пра існаванне камп'ютарнай тэхнікі нашы школьнікі ведалі выключна тэарэтычна, пра персанальныя камп'ютары ніхто яшчэ не марыў, на 3D-мадэляванне і стварэнне ўласных мультфільмаў на ўроках не замахваўся, таму змест гэтага прадмета, як і сэнс праграмавання, так і застаўся для многіх таямніцай за сямю пячаткамі. Сучасныя дзеці з камп'ютарамі і шматлікімі гаджэтамі на «ты» і ў многіх пытаннях апярэджваюць сваіх бацькоў. Чаму іх трэба вучыць на школьных уроках інфарматыкі і ў якім увогуле ўзросце трэба распачынаць яе выкладанне? Каб знайсці адказы на свае пытанні, мы накіраваліся ў Нацыянальны інстытут адукацыі. Нашымі суразмоўцамі сталі начальнік навукова-даследчага цэнтра НІА, доктар педагагічных навук, дацэнт Васіль РУСЕЦКІ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык лабараторыі матэматычнай і прыродазнаўчанавуковай адукацыі Наталля КАСЦЮКОВІЧ і галоўны навуковы супрацоўнік гэтай лабараторыі, доктар педагагічных навук, прафесар БДУ Віктар КАЗАЧОНАК.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
1 09 2016 г.

Чым слова адгукнецца

Каб не помсцілі...

Група навукоўцаў з Кембрыджскага ўніверсітэта, Швейцарскай вышэйшай тэхнічнай школы Цюрыха і ўніверсітэта Таронта прааналізавала звесткі за 10 гадоў пра сем'і з дзецьмі 9-11 гадоў, у якіх у гэтым узросце змяніліся настаўнікі (больш чым у 80 краінах).

Школьнікаў і настаўнікаў прасілі запоўніць анкеты з пытаннямі пра ўзаемаадносіны паміж імі. Навукоўцы апытвалі і бацькоў, якія маглі ацаніць, ці добра настаўнік ставіцца да іх дзіцяці. Звесткі, з якімі працавалі навукоўцы, змяшчалі таксама аналіз паводзінаў школьнікаў. Настаўнікі і бацькі паведамлялі, наколькі агрэсіўна або задзірліва паводзілі сябе дзеці, ці адчувалі яны хваляванне, дэпрэсію або сіндром дэфіцыту ўвагі. Вучні, у сваю чаргу, таксама ацэньвалі свой эмацыянальны стан.

Супастаўленне даных паказала, што дзеці, якія заявілі аб добрым стаўленні да сябе з боку настаўнікаў, былі больш спакойнымі. У выпадку, калі і настаўнік, і вучань паведамлялі аб добразычлівым стаўленні адзін да аднаго, паводзіны апошніх былі на 38% менш агрэсіўнымі. Акрамя таго, школьнікі, якія добра ставіліся да сваіх настаўнікаў, паводзілі сябе на 56% менш задзірліва: яны радзей спрачаліся або помсцілі за крыўды.

Даследаванні пра сувязь паміж паводзінамі школьнікаў і іх узаемаадносінамі з настаўнікамі праводзіліся ўжо неаднаразова. Псіхолагі з Місурыйскага ўніверсітэта раней даказалі, што ў вучняў, да якіх дрэнна ставяцца настаўнікі, бываюць праблемы з самакантролем і канцэнтрацыяй. У той жа час настаўнікі, якія падтрымліваюць вучняў, станоўча ўплываюць на іх паспяховасць і якасць школьнага жыцця.

Інавацыі ў адукацыі

Галоўнае — умець мысліць

У Фінляндыі з пачаткам навучальнага года пачне рэалізоўвацца новая вучэбная праграма для сярэдняй школы. Перш за ўсё яна павысіць значэнне ролі самога навучэнца ў актыўным навучанні і дыялогу, прымусіць школьнікаў быць актыўнымі шукальнікамі ведаў.

Метады выкладання стануць больш рознабаковымі, а межы паміж рознымі дысцыплінамі паступова разбурацца. У кожным навучальным годзе школьнікі будуць працаваць, сама меней, над адным міждысцыплінарным праектам. Камп'ютарамі вучні будуць карыстацца пры вывучэнні ўсіх школьных прадметаў, пачынаючы з першага класа.

У новую вучэбную праграму ўключана больш экскурсій і азнаямленчых паездак, каб зрабіць працэс навучання больш цікавым і займальным.

У новай школьнай праграме выдзелена сем галоўных мэт. Задача школы — навучыць дзяцей самастойнаму мысленню і ўменню вучыцца, міжкультурнай камунікацыі, клапаціцца пра сябе, інфармацыйнай адукаванасці і медыядукаванасці, камп'ютарным тэхналогіям, навыкам працоўнага жыцця і прадпрымальніцтву, навыкам удзелу ў сацыяльным жыцці.

Поспех новай вучэбнай праграмы, адзначае выданне Yle.fi, шмат у чым залежыць ад настаўнікаў і кіраўнікоў школ. Старых метадаў навучання ўжо недастаткова, да таго ж і падручнікі не паспяваюць за зменамі. Перагляд стаўлення да вучобы патрабуецца і ад саміх школьнікаў і іх бацькоў.

Між іншым, вынікі PISA 2012 года паказваюць, што ў Фінляндыі мінімальны разрыў паміж самымі моцнымі і слабымі вучнямі, рознымі школамі і рэгіёнамі.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

ЖЫЦЦЮ НАВУЧЫЦЬ... ІНФАРМАТЫКА

Камп'ютар: сродак ці забава?

— Як вы лічыце: ці не адстае сённяшняя школьная праграма ад развіцця інфармацыйнага грамадства і камп'ютарных тэхналогій? Напрыклад, знаёмства з інтэрнэтам і сацыяльнымі сеткамі ў школе адкладзена на старшыя класы. Хоць, насамрэч, яно адбываецца намнога раней... І да з'яўлення ў раскладзе ў шостым класе інфарматыкі ўжо ўсе дзеці маюць той ці іншы досвед знаёмства ці нават работы з камп'ютарам...

Васіль Русецкі: — Навучальныя праграмы абнаўляюцца ў сярэднім раз у пяць гадоў. Адна з галоўных асаблівасцяў «Інфарматыкі» ў тым, што прадметнае поле гэтай дысцыпліны пастаянна пашыраецца, абнаўляецца, значыць, павінны змяняцца і падыходы да яе зместу і выкладання ў школе. На мой погляд, перад інфарматыкай стаіць самае актуальнае пытанне сучаснай адукацыі: як навучыць жыць у свеце, які ўвесь час мяняецца? **1 верасня шасцікласнікі пачнуць займацца па новай праграме, якая была распрацавана ў 2015 годзе.**

Віктар Казачонак: — Я з'яўляюся адным з членаў рабочай групы па стварэнні новай праграмы. Да работы над ёй прыцягваліся як прадстаўнікі ВНУ, інстытутаў развіцця адукацыі, так і школьныя педагогі. Натуральна, вывучаўся досвед розных краін. Пытанне, у якой ступені знаёміць з камп'ютарнымі навукамі тых, хто не збіраецца займацца імі прафесійна, актуальнае для ўсіх. У шэрагу краін вывучэнне інфарматыкі, уключаючы асновы праграмавання, сталі пераносіць у пачатковую школу. Гэтым шляхам пайшлі, напрыклад, Паўднёвая Карэя і Японія. А ў асобных штатах ЗША інфарматыка ўвогуле не з'яўляецца абавязковым прадметам у школе. Спрэчкі вядуцца вакол двух асноўных кірункаў. Шмат прыхільнікаў ёсць у ідэі больш ранняга вывучэння інфарматыкі (хоць бы з другога класа). Разам з тым дастаткова вялікая колькасць іх апанентаў лічаць, што ў школе ўвогуле не патрэбны асобны прадмет «Інфарматыка». Усё, што тычыцца апрацоўкі інфармацыі (скажам, напісаць тэкст ці зрабіць прэзентацыю), павінна выкладацца дзецям на іншых уроках.

Васіль Русецкі: — Пачатковая школа — той час, калі дзіця павінна авалодаць традыцыйнымі сродкамі камунікацыі, таму першачарговая задача педагогаў — навучыць дзіця чытаць: не проста складваць літары ў словы, а разумець сэнс тэксту, каб яно магло аперыраваць атрыманай з яго інфармацыяй. Прычым гэту задачу нельга перанесці на больш позні ўзрост: ад таго, ці навучыцца дзіця ў пачатковай школе чытаць з глыбокім разуменнем прачытанага, залежыць яго поспех на наступных этапах школьнага навучання.

— Але паралельна з чытаннем дзіця засвойвае і гаджэты. Таму, можа, ёсць сэнс не пускаць працэс на самацёк, а ўзяць яго пад адпаведнае педагагічнае суправаджэнне?

Віктар Казачонак: — Цяжка не пагадзіцца з тым, што сучасныя дзеці больш дасведчаныя ў лічбавым плане, яны з гэтым выраслі. Але тое, што дзіця ў пяць-шэсць гадоў гуляе ў камп'ютарныя цацкі, азначае толькі, што яно добра гуляе ў цацкі. І не больш за тое. Гэта ніяк не ўплывае на яго ўзровень камп'ютарнай адукаванасці. Інфарматыка ў тым выглядзе, як яна выкладаецца цяпер у нашых школах, уключае некалькі важных блокаў: гэта не толькі камп'ютарная асвета (атрыманне базавых ведаў пра камп'ютар, звестак пра аперацыйныя сістэмы, навыкаў для працы з офіснымі праграмамі), але і развіццё логікі, алгарытмічнага мыслення, непасрэдна стварэнне камп'ютарных праграм.

Васіль Русецкі: — Проста ўключыць-выключыць камп'ютар, скапіраваць файл, загрузіць і адправіць па інтэрнэце фатаграфію могуць многія дзеці. Але ж ці можна назваць гэтыя найпрасцейшыя навыкі лічбавай адукаванасцю? Задача педагога — навучыць дзіця працаваць з інфармацыяй. Камп'ютарная асвета азначае ўменне ператварыць камп'ютар у свайго роду знешні орган мыслення і памяці, якім можна свабодна і эфектыўна карыстацца. Важную ролю ў сучасным грамадстве адыгрывае ўменне хутка зразумець прынцып пабудовы той ці іншай інфармацыйнай сістэмы і пісьмова сфармуляваць запыт пры пошуку інфармацыі. Інакш можна застацца простага карыстальнікам карцінак у інтэрнэце.

Віктар Казачонак: — Большасць крытыкі ў бок школьных урокаў па інфарматыцы, калі мы пачалі працаваць над новай праграмай, гучала з боку бацькоў. Найбольш частая прапанова — увогуле ўбраць раздзел «Алгарытмізацыя і праграмаванне» з курса інфарматыкі ў школе. Аргумент — «нашы дзеці не будуць праграмістамі». Прапаноўвалі таксама перанесці вывучэнне інфарматыкі на старшую ступень школы. Увогуле падчас грамадскага абмеркавання вельмі часта сутыкаюцца ўзаемавыключальныя пункты погляду: адны выступаюць за інфарматыку з дзіцячага садка, іншыя — за яе выключэнне са школьнай праграмы або, як варыянт, вывучэнне толькі ў профільных класах. Частка бацькоў кажа, што інфарматыка — занадта складаная для дзяцей дысцыпліна, а іншыя, наадварот, сцвярджаюць, што школьная праграма па інфарматыцы — празмерна лёгкая.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Задачка з некалькімі невядомымі

— Як ні дзіўна, але пры татальным захапленні дзяцей камп'ютарамі, пытанне «Навошта мне інфарматыка?» па-ранейшаму стаіць даволі востра. З камп'ютарнай асветай усё зразумела — без гэтых ведаў абысціся немагчыма. А як патлумачыць дзецям, асабліва з гуманітарным складам розуму, што можа даць ім вывучэнне праграмавання?

Наталля Касцюковіч: — А навошта вучыць у школе матэматыку? Можа, і вуснаму лічэнню дзяцей вучыць не трэба, калі ёсць калькулятар, які ўсё за нас зробіць? Матэматыка — гэта гімнастыка для розуму, якая фарміруе і развівае здольнасць лагічна мысліць і аргументавана разважаць. Як казаў Міхаіл Ламаносаў, «матэматыку ўжо за тое трэба вучыць, што яна розум у парадак прыводзіць». Мы павінны дзяцей вучыць вырашаць пастаўленыя праблемы, рашыць любую задачу з адным ці некалькімі невядомымі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Згодна, што не ўсе школьнікі стануць праграмістамі, сістэмнымі адміністратарамі ці вэбдызайнерамі... Але наш час нездарма назвалі інфармацыйнай эпохай. Напэўна, сэнс інфарматыкі яшчэ і ў тым, каб усе разумелі, з чым яны сутыкаюцца штодня і як гэта дзейнічае. Добра складзены курс інфарматыкі можа развіць праблемнае мысленне, логіку, здольнасці да мастацкай творчасці. Складана прыдумаць іншы такі ўдалы «мост» для злучэння ўсяго, чаму павінны навучыцца школьнікі і студэнты. Інфарматыка — рэкардсмен па колькасці міждысцыплінарных сувязяў. Навыкі, атрыманыя падчас вывучэння гэтага прадмета, спатрэбяцца як пры вывучэнні дакладных навук (камп'ютарным мадэляванні, складанні графікаў, схем, табліц), так і ў рабоце над дысцыплінамі гуманітарнага цыкла, напрыклад стварэнні прэзентацый.

Віктар Казачонак: — Уменне складаць алгарытмы спатрэбіцца кожнаму ў паўсядзённым жыцці. Любы працэс трэба ўмець раскласці на часткі, разбіць свой план на пакрокавыя элементы. Вы павінны ўлічваць, што на нейкім кроку можа адбыцца збой ці разгалінаванне задачы. **У аснове алгарытмізацыі — прынцыпы стварэння плана дзеянняў, які прывядзе да патрэбнага выніку пры любых абставінах ці пачатковых даных.**

Праграмаванне фарміруе сістэмнае мысленне, што важна для развіцця асобы ў цэлым. А гэта і ёсць такая аснова, якая дапамагае чалавеку быць паспяховым у розных сферах. Праграмаванне не абавязкова павінна быць звязана з прафесійнай дзейнасцю чалавека. Нам патрэбна змяніць сваё мысленне ў гэтым кірунку і ставіцца да авалодання згаданым навыкам, як да вывучэння замежнай мовы, таму што гэта і ёсць яшчэ адзін спосаб камунікацыі. **Зразумець, як працуюць камп'ютарныя тэхналогіі, гэтак жа неабходна, як засвоіць пісьмо, чытанне і навыкі лічэння. Гэта чацвёрты від базавай пісьменнасці.**

Васіль Русецкі: — Прыёмы работы з інфармацыяй — атрыманне, апрацоўка, перадача звестак — спатрэбяцца чалавеку любой прафесіі ў любым узросце і ў любы час. Атрымліваючы неабходныя матэрыялы з дапамогай інтэрнэту, школьнікі вучацца структураваць, абагульняць і сістэматызаваць вялікія аб'ёмы інфармацыі.

Фоташоп — у 8-м класе

— Што зменіцца ў навучальнай праграме з 1 верасня?

Віктар Казачонак: — Паколькі большасць дзяцей маюць уласныя мабільныя ўстройствы, многія тэмы ў школьнай праграме (знаёмства з інтэрнэтам, электроннай поштай, сацыяльнымі сеткамі) цяпер пераносяцца са старшай ступені школы ў шосты клас. На першае знаёмства з камп'ютарам цяпер адводзяцца дзве гадзіны, а не шэсць. Гэта, хутчэй, сістэматызацыя ведаў, якія ўжо ёсць у вучняў. Мабільныя сістэмы будуць праходзіць нароўні з камп'ютарнымі. У шосты клас перанеслі і тэму стварэння прэзентацый. Настаўнікі іншых дысцыплін такія навыкі толькі вітаюць і нярэдка просяць школьнікаў аформіць на камп'ютары сваю работу. Існуе логіка, якая дазваляе канкрэтызаваць запыт, таму ў сёмым класе ўведзена тэма «Уяўленне пра логіку выказванняў і мноства аперацый над імі». Школьнікі будуць вывучаць лагічныя аперацыі, з дапамогай якіх складаецца запыт. Ім будуць тлумачыць, якую логіку разумее камп'ютар і чаму ён выдае мора непатрэбнай інфармацыі. Асновы анімацыі з 9-га класа перамясціліся ў восьмы. Тэмы «Інфармацыйныя мадэлі» і «Электронныя таблiцы» — з 10-га ў 9-ты клас, тэма «Базы даных» — з 11-га ў 10-ты клас. Па новай праграме ў 8-м класе ўводзіцца апрацоўка аўдыя- і відэаінфармацыі.

Самы складаны раздзел — «Алгарытмізацыя і праграмаванне» — таксама перагледжаны, каб зрабіць яго больш даступным. У 6-7 класах вучні будуць знаёміцца з асноўнымі алгарытмічнымі канструкцыямі і іх выканаўцамі: Чарцёжнікам і Робатам. Толькі пасля гэтага — з класічнымі мовамі праграмавання. Шасцікласнікі пачнуць займацца па новай праграме ў верасні гэтага года, сямікласнікі — у 2017 годзе, васьмікласнікі — у 2018-м і гэтак далей.

Каб не адстаць ад часу...

— Парк высокіх тэхналогій ініцыяваў праект «Праграмаванне ў асяродку Scratch», падрыхтаваў педагогаў, і ўжо ў новым навучальным годзе ў шэрагу школ краіны пачне выкладацца факультатыў для вучняў пачатковай школы. Атрымліваецца, што спецыялісты ў галіне IT робяць стаўку на малодшых школьнікаў?

Віктар Казачонак: — Гэта сумесны праект ПВТ і Міністэрства адукацыі па ўкараненні курса асноў алгарытмічнага мыслення і праграмавання. У якасці падмурку быў абраны распрацаваны ў Масачусецкім універсітэце візуальны асяродак праграмавання пад назвай Scratch, які паспяхова выкарыстоўваецца для навучання малодшых школьнікаў ва ўсім свеце. Вучыць дзіця пры дапамозе Scratch могуць нават бацькі, бо праграма не патрабуе спецыяльных ведаў у праграмаванні. Раней падобных абалонак з графічным інтэрфейсам не было, таму і інфарматыка пачыналася ў школе пазней. А са з'яўленнем такіх вось праграмных сродкаў «азам» праграмавання можна навучаць ужо і вучняў другога класа.

Праграмаванне маладзее ва ўсім свеце. У шэрагу краін праграмаванне дзецям (нават ужо з пяці гадоў) выкладаецца па ініцыятыве школьных адміністрацый, грамадскіх арганізацый і кампаній. Перад школьнай інфарматыкай ставяць больш шырокую задачу, чым проста падрыхтаваць будучыя кадры для сферы IT — вырасціць усебакова развітага ў плане IT чалавека. Чалавека, які не згубіцца ў нашым высакахуткасным лічбавым свеце...

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

Ідэі маладых

У КРУГАСВЕТКУ — ПРАЗ «ТЭЛЕПОРТ»

Ідэя вокамгненных перамяшчэнняў «вырасла» з мясцовага інтэрнэт-каталога. Распрацоўшчыкі — чацвёра маладых людзей з Брэста — падумалі, што напісаць каментарый пра якую-небудзь мясціну добра, але пабываць там куды цікавей. За паўгода стварылі апісанне праекта, дзе для «кругасветнага падарожжа» спатрэбіцца толькі камп'ютар і доступ у інтэрнэт. Мяркуецца, што чалавек заходзіць на сайт, выбірае краіну і атрымлівае анлайн-відэатрансляцыю з пэўнага горада. Праграма дапаможа пабываць у Маскве, зазірнуць у Мінск, паглядзець, якое надвор'е ў Берліне і скончыць падарожжа дзе-небудзь у Індыі. І ўсё гэта за некалькі гадзін. Прычым, не проста «зазірнуць у акенца», а атрымаць поўны агляд на 360 градусаў: можна павярнуцца кругом, паглядзець уверх і ўніз, а то і прашпацыраваць па вуліцы ў любы час і надвор'е — проста перамяшчаючыся ад камеры да камеры.

За рэалізацыю брастаўчане ўзяліся хутка. Праграміст Дзяніс Дземідзюк і web-праграміст Антон Пастаялка заняліся распрацоўкай сайта, Вольга Каласоўская, менеджар па рабоце з кліентамі, прымерала на сябе ролю маркетолага і адміністратара сайта, а Антон Любахінец, менеджар праекта, стаў адначасова адказным за яго тэхнічную частку.

З электронікай і праграмаваннем брэсцкі вынаходнік знаёмы даўно. Антон сам спраўляецца і з паяльнікам, і з камп'ютарнымі кодамі. Яшчэ студэнтам БрДТУ ён прынёс на міжнародны конкурс навукова-тэхнічнай творчасці навучэнцаў Саюзнай дзяржавы «Таленты XXI стагоддзя» прыбор, які можа замяніць чалавеку з аслабленым зрокам кіёк і сабаку-павадыра. Прыстасаванне памерам і формай нагадвае наручны гадзіннік, яно ўмее вібрасігналам папярэджваць аб прадметах побач, чытае тэкст, калі навесці руку на старонку, і можа паслаць сігнал трывогі ў службу ратавання ці родным. Праект амаль скончаны, разумная машынка пратэставаная, засталося знайсці інвестараў, якія б захацелі запусціць яе ў вытворчасць. А пакуль хлопец не сядзіць на месцы і ў самым літаральным сэнсе будуе віртуальныя тэлепорты: шукае, адладжвае, дапрацоўвае анлайн-камеры і сеткавае абсталяванне. Тэорыю перамяшчэнняў у прасторы праз інтэрнэт каманда апрабуе ў Брэсце.

— Мы пакуль устанавілі 14 пастаянных анлайн-відэакамер у горадзе. Яны звычайныя, але ўжо збіраюць прагляды. З аглядам у 360 градусаў запісана некалькі ролікаў, усё відэа можна пабачыць на voblako.by, — расказвае Антон Любахінец. — За тры месяцы хочам скончыць мінімальную жыццяздольную мадэль. Гэта павінны быць 10 анлайн-відэакамер з поўным аглядам. Размешчаныя яны будуць у еўрапейскіх сталіцах і Маскве. Канешне, устанавіць некалькі сотняў відэакамер сіламі чатырох энтузіястаў нерэальна. Тым больш што для карыстальнікаў інтэрнэту прагляд відэа будзе бясплатным. У той жа час кожны горад напоўнены камерцыйнымі аб'ектамі. Мяркуецца, што камеры «Тэлепорта» будуць знаходзіцца на арэндаваных бізнесменамі будынках, а спецыяльная функцыя дазволіць прадпрымальнікам размяшчаць на арыгінальнай карцінцы рэкламу ў выглядзе дапоўненай рэальнасці, якую паглядзіць вялікая колькасць карыстальнікаў інтэрнэта.

Рэкламная інфармацыя не будзе замінаць людзям атрымліваць асалоду ад відаў, наадварот, стане дапаўняць іх і несці карысныя звесткі. Напрыклад, на Краснай плошчы вы зможаце ўбачыць віртуальнага гіда, які раскажа вам пра яе.

— Мы распытвалі нашых патэнцыйных партнёраў, і 37 працэнтаў бізнесменаў згодныя ўстанаўліваць камеры на арэндаваныя імі будынкі, — сцвярджае Антон. — Яшчэ мы пагаварылі з магчымымі карыстальнікамі і выйшла, што праект цікавы больш як 80 працэнтам апытаных. Нехта хоча зладзіць падарожжа і папярэдне паглядзець віды, некага цікавіць загружанасць дарог. Людзі спадзяюцца, што анлайн-відэа павысіць бяспеку ў горадзе. Некаторыя бацькі казалі, што змогуць адсачыць шлях дзяцей у школу і дамоў...

Таксама вынаходнікі задумаліся над праграмай для мабільнікаў, каб чалавек мог карыстацца тэлефонам яшчэ і як сродкам віртуальнай рэальнасці. Памясціць свой гаджэт у спецыяльную канструкцыю, падобную на акуляры, і вандраваць па свеце з «эфектам прысутнасці», не пакідаючы пры гэтым пакой. Ідэяй ужо зацікавіліся расійскія інвестары, цяпер каманда «Тэлепорта» вядзе з імі перамовы.

Магчыма, навагоднія віншаванні беларусы і расіяне змогуць перадаць адзін аднаму, памахаўшы рукой у камеру. Ва ўсякім выпадку, брэсцкія вынаходнікі на гэта спадзяюцца. А пакуль Антон з сябрамі ўдасканальвае сайт, якасць відэа і плануе новыя праекты «пра запас».

Рагнеда ЮРГЕЛЬ. *yurgel@zviazda.by*

«ФІТАНЯШКІ» ЯК СТЫМУЛ

Гэта пачалося, напэўна, адразу ж, як з'явілася павальная мода на фітнес. Як толькі словы «прысед», «цяга» і «складаныя вугляводы» сталі гучаць ледзь не з кожнага праса, а сацыяльныя сеткі запаланілі сэлфі з трэнажорак і фотаздымкі нізкакаларыйных сняданкаў, тыя, хто быў далёкі ад здаровага ладу жыцця, прыняліся асуджаць новае масавае захапленне. «Ну колькі можна», «Знайшлі, чым ганарыцца», «Лепш бы мазгі качалі», — раз-пораз выказваецца хто-небудзь з незадаволеных.

Я, хоць і знаходжуся, хутчэй, па іншы бок барыкад, у чымсьці пагаджуся. Некаторыя дзяўчаты ўспрынялі гэты трэнд як яшчэ адну нагоду для самалюбавання. А фітнес-залу — як новыя дэкарацыі для фотасесій. Нафарбаваныя, з распушчанымі валасамі і без адзінай кропелькі поту, пазіруюць яны каля трэнажораў і ў раздзявальнях. І няважна, што практыкаванне выконваецца няправільна, галоўнае — удалы ракурс. Каравей, альтэрнатыва фатаграфіям у купальніках у няпляжны сезон (чаго там хаваць: фігура ў спартыўнай форме не менш эфектная, чым у бікіні).

Але што да самой моды на фітнес, то, як па мне, гэта найлепшы трэнд за апошнія гады. Бо ён не патрабуе ахвяраваць нечым дзеля часовых стандартаў прыгажосці (не бяру выпадкі, калі захапленне перарастае ў нездаровы фанатызм). Наадварот, красоўкі перасталі быць выключна спартыўным абуткам і замяняюць абцасы нават у камплекце з сукенкамі і спадніцамі. Есці шмат (няхай і маленькімі порцыямі) не лічыцца ганебным. А на стадыён увечары прыходзяць не толькі, каб папіць піва.

У рэшце рэшт якая розніца, якім чынам папулярызаваць здаровы лад жыцця? Зрабіць гэта модным куды больш эфектыўна, чым чытаць нудныя лекцыі пра неабходнасць збалансаванага харчавання і фізічнай актыўнасці.

Вядома, дзяўчаты ў большасці запісваюцца на крос-фіт і зумбу не для таго, каб умацаваць сэрца. Мэта нумар адзін — пругкія ягадзіцы і плоскі жывот. Але ў выніку тыя, хто застаецца ў фітнесе больш чым на пару пробных трэніровак, самі пачынаюць задумвацца не толькі пра знешні эфект ад заняткаў.

Іншыя справа, што адпавядаць новай модзе не так проста. Каб быць у трэндзе, трэба пачаць працаваць над сабой. Ты б, можа, і не хацеў (хоць у глыбіні душы не надта сабой задаволены), але ж кожны дзень табе нагадваюць, як гэта проста і карысна — займацца фітнесам. Сябры посцяць у стужку скрыншоты кіламетражу, які ўдалося набегаць зранку, пішуць, колькі калорый паспелі спаліць на бегавой дарожцы, і хваляцца фоткамі «пасля». Пасля гэтага заставацца ў зоне камфорту, дзе ты збіраўся дайсці да залы калі-небудзь, калі будзе час і настрой, ніяк не атрымліваецца.

Раздражняюць не самі «фітаняшкі», а ўласнае бяссілле. Вядома, прасцей абурацца за маніторам і пісаць у каментарыях, што цягаць жалеза — гэта не па-жаноцку і дзяўчаты з формамі (якія, насамрэч, ужо страцілі форму) выглядаюць куды прывабней, чым атлетычныя аматаркі спорту. Незадаволеныя новай модай пішуць, што ні ў якім разе не зайздросцяць. Сур'ёзна? Было б гэта так, вы б спакойна рэагавалі на чарговае фота з залы і рэцэпт дыетычнага пірага.

А на «фітаняшак» злавацца не трэба. І вось чаму: канадскія дыетолагі высветлілі, што падцягнутыя сябры дапамагаюць скінуць вагу. У даследаванні ўдзельнічала каля 10 тысяч чалавек. Ва ўсіх былі лішнія кілаграмы, ад якіх яны хацелі пазбавіцца. Спачатку навукоўцы апыталі валанцёраў эксперымента наконт таго, ці ёсць у іх стройныя сябры. Аказалася, што практычна ва ўсіх удзельнікаў даследавання прыяцелі таксама былі «ў целе». Але ўжо праз год у тых, хто актыўна змагаўся з лішняй вагой, з'явіўся хоць бы адзін падцягнуты сябар. Як той казаў, не можаш змяніць абставіны, змяні сваё стаўленне да іх.

Проба пераможа

ПРЫЗАВАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ

У склад беларускіх каманд, якія выступаюць на міжнародных прадметных алімпіядах, трапляюць вучні не толькі гімназій, але і звычайных, у тым ліку вясковых, школ.

Пра гэта расказала **кансультант упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Анжэла КУДАЯРАВА**. Паводле яе слоў, сістэма нацыянальнага адбору дае магчымасць трапіць на міжнародны этап любому таленавітаму школьніку. «Напрыклад, у 2014 годзе пераможцам адной з міжнародных алімпіяд у нас стаў вучань сельскай школы з Гродзенскай вобласці», — адзначыла Анжэла Кудаярава.

Розніца ў колькасці заваяваных медалёў штогод складае не больш за адзін-два ў большы ці меншы бок. Напрыклад, сёлета з 46 міжнародных «алімпіяднікаў» 42 прывезлі ў Беларусь медалі, 5 з іх — залатыя. Галоўнымі канкурэнтамі Беларусі ў барацьбе за прызавыя месцы лічацца Кітай, ЗША і Расія.

«Адзначу, што мы не толькі рыхтуем дзяцей да ўдзелу ў алімпіядах, але і самі праводзім спаборніцтвы такога кшталту, — дадала **галоўны спецыяліст упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Мінадукацыі Алена СЕНЧАНКА**. — Напрыклад, летась дзеці з 25 краін прыехалі да нас, каб паўдзельнічаць у Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе сярод дзяўчат. Права правесці ў сябе турнір мы атрымалі ў 2013 годзе, калі наша каманда дэбютавала на гэтай алімпіядзе і адразу ж здзейсніла фурор: з чатырох удзельніц тры ўзялі «золата», а адна — «серабро».

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Сярэбраны прызёр 48-й міжнароднай хімічнай алімпіяды і 50-й Мендзялееўскай алімпіяды школьнікаў па хіміі Міраслаў Макарэвіч і пераможца ў секцыі «Матэматыка» 23-й Міжнароднай канферэнцыі юных навукоўцаў па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы і экалогіі, бронзавая прызёрка Міжнароднага турніру юных матэматыкаў Ліяна Хазалія.

Ці дапамагаюць школьным «алімпіяднікам» іх веды падчас вучобы ў ВНУ? **Настаўнік матэматыкі сталічнай гімназіі №41, дацэнт факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Барыс КАМРАКОЎ** лічыць, што такія поспехі далёка не заўсёды гарантуюць бесклапотнае жыццё ва ўніверсітэце: «Так, гэтыя вучні сапраўды маюць невялікую перавагу перад астатнімі першакурснікамі. Яны ведаюць шмат таго, што важна для ўдзельнікаў алімпіяд, але могуць нават не чуць пра тое, што на спаборніцтвах не было патрэбна».

Тым не менш, большасць пераможцаў прадметных алімпіяд знаходзяць сябе ў жыцці. Сярод іх можна назваць, напрыклад, цяперашняга пасла Беларусі ў Кітаі Кірыла Рудага, кіраўніка беларускага офіса кампаніі «Яндэкс» Аляксея Сікорскага і многіх іншых. Былых «алімпіяднікаў» нярэдка прыцягваюць і да падрыхтоўкі новых пакаленняў таленавітых дзяцей, за лёсамі пераможцаў сочаць і ў раённых упраўленнях адукацыі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

Унёсак моладзі ў аднаўленне святыні

У рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі» штатныя работнікі Гомельскай абласной арганізацыі і актывісты БРСМ прынялі ўдзел у добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на тэрыторыі касцёла ў Рагачове.

— Ён мае доўгую і вельмі цікавую гісторыю. У 1783 годзе ў горадзе быў адкрыты драўляны каталіцкі храм, які насіў назву Беззаганнага Зачацця Дзевы Марыі. Цяжка сказаць, хто і калі перайменаваў яго. Магчыма, гэта быў мясцовы пробашч ксёндз Бернатовіч, чыімі намаганнямі быў узведзены новы будынак з чырвонай цэглы ў стылі неаготыкі, асвечаны летам 1912 года ў гонар Святога Антонія Падуанскага, — праводзіць гістарычны экскурс каардынатар валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» Гомельскай абласной арганізацыі БРСМ Вераніка Ражкова.

Касцёл дзейнічаў да канца 1930-х гадоў, а пасля закрыцця пражыў шмат драматычных падзей і разбурэнняў. У розны час у яго будынку размяшчаліся зерняскладз, цэх па вытворчасці напояў і марожанага, пажарны пост і хлебазавод. Асабліва моцна пацярпела святыня ў Вялікую Айчынную: падчас баёў за вызваленне горада ў касцёл трапіла некалькі снарадаў. З 1970-х гадоў храм пуставаў, і толькі праз трыццаць гадоў будынак быў перададзены мясцовай каталіцкай парафіі. Напачатку 2000-х пачалася яго рэстаўрацыя. Работы па аднаўленні фасада старажытнага будынка вядуцца з 2003 года. Рэканструкцыя часткова была завершана да 100-годдзя асвячэння храма. Ён унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Маладыя людзі, якія шчыравалі на тэрыторыі касцёла, могуць па праве ганарыцца, што зрабілі свой унёсак у аднаўленне славутай святыні рагачоўскай зямлі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
1 09 2016 г.

РазМЕРКАВАННЕ

ЗНАЙДЗІ СВАЁ РЭЧЫШЧА

З досведу інжынера-гідратэхніка

Беларусь заўсёды славілася сваімі балотамі. Але іх вялікая прыродная каштоўнасць адыходзіла на другі план, калі ключавым станавілася пытанне сельскай гаспадаркі. Менавіта таму ў мінулым стагоддзі сапраўднай індустрыяй у БССР стала асушэнне забалочаных земляў і перавод іх у гаспадарчае карыстанне. У рэшце рэшт экалагічныя наступствы такой палітыкі заўважылі, і масавая меліярацыя была спынена. Тым не менш і сёння па ўсёй краіне працуюць людзі, якія даглядаюць ужо створаныя асушальныя сістэмы. Адзін з іх — малады спецыяліст Чэрвеньскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм Павел ЯНЧУКОВІЧ.

З хлопцам мы сустракаемся ў іншым рэгіёне Міншчыны — у Лагойскім раёне. Побач з вёскай Масцішча, што на рацэ Цна, інжынер-гідратэхнік разам з групай падначаленых дапамагае мясцовым калегам з ачысткай меліярацыйных сістэм. Брыгада рабочых, якой кіруе Павел, павольна рухаецца ўздоўж аднаго з каналаў. Мужчыны бензапіламі зразаюць непатрэбную расліннасць па яго берагах.

— Я родам з Гродзеншчыны, нарадзіўся ў Зэльве, — расказвае пра сябе хлопец. — Яшчэ ў дзяцінстве меў невялікі досвед працы «меліяратара», бо летам мы падпрацоўвалі ў мясцовым прадпрыемстве меліярацыйных сістэм (ПМС), дзе мой бацька быў кранаўшчыком. Занятак быў простым: дапамагалі старэйшым укладваць дрэнаж, даглядаць каналы. Пасля школы паступіў у Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках на спецыяльнасць «Меліярацыя і водная гаспадарка». Чаму выбраў гэтую ВНУ? Калі жывеш у пасёлку накшталт Зэльвы, сельскагаспадарчы кірунак у любым выпадку будзе бліжэй. Акрамя таго, туды паступала шмат маіх сяброў. Разам, як кажуць, весялей, і заўсёды ёсць да каго звярнуцца па дапамогу. Вучыцца ў Горках мне падабалася, зрэшты, думаю, у большасці людзей самыя добрыя ўспаміны пра сваё студэнцтва.

Розніца ва ўзросце для супрацоўнікаў прадпрыемства — не праблема.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У пасёлак Смілавічы, дзе базуецца Чэрвеньскае ПМС, хлопец трапіў па размеркаванні. У сельскагаспадарчую акадэмію адтуль прыйшоў запыт адразу на двух спецыялістаў, і Павел разам з дзяўчынай, з якой пазнаёміўся ў Горках, вырашылі накіравацца туды. У Смілавічах маладым спецыялістам адразу выдзелілі два пакоі ў доме, які знаходзіцца на тэрыторыі ПМС. Пасля звальнення адной з супрацоўніц, якая займала трэці пакой, увесь будынак аказаўся ў карыстанні цяпер ужо маладой сям'і. У «інтэрнаце» ёсць гарачая вада і каналізацыя. Адзінае, што даводзіцца набываць, — газавыя балоны, але гэта дробязь у параўнанні з жыллёвымі праблемамі, з якімі сутыкаюцца многія маладыя спецыялісты.

— У абавязкі інжынера-гідратэхніка ўваходзіць кіраўніцтва брыгадамі рабочых і афармленне патрэбных дакументаў, — уводзіць у курс справы Павел. — Калі казаць у глабальным сэнсе, то непасрэдна меліярацыю мы не праводзім. Як, у прынцыпе, не праводзяць яе і па ўсёй Беларусі. Наша галоўная задача — даглядаць ужо створаныя сістэмы, рэканструяваць іх. Напрыклад, недзе з цягам часу яны прыйшлі ў нягоднасць: каналы заіліліся, падняўся ўзровень вады, на берагах выраслі кусты... Мы ўсё прыводзім у належны стан, кладзём новы дрэнаж ці прамываем стары, пазбаўляемся ад расліннасці. Нават у Чэрвеньскім, здавалася б, не самым забалочаным раёне, дзясяткі тысяч гектараў меліяраваных зямель. Ёсць як сістэмы адкрытага тыпу — каналы, так і закрытага — дрэнаж. І за ўсім гэтым трэба глядзець. Цяжка нават уявіць, колькі работы ў меліяратараў, скажам, на Палессі.

Дзе-нідзе спецыялісты ПМС, наадварот, дэмантуюць старыя сістэмы. Напрыклад, нядаўна Павел з калегамі рэалізоўваў адзін з праектаў па Праграме развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

— У Савецкім Саюзе даволі шырока практыкавалася так званая лесамеліярацыя, — тлумачыць хлопец. — Яе вынікі да нядаўняга часу былі заўважаны ў Чэрвеньскім раёне. Каналы пракопваліся непасрэдна ў лясным масіве, каб асушыць глебу. Меркавалася, што гэта паспрыяе больш актыўнаму росту драўнінных парод, напрыклад, знікнуць так званыя «карлікавыя» сосны, а замест іх будзе расці паўнавартасны лес. Аднак гэта стратэгія не заўсёды спраўдзілася. Больш за тое, пачалася мінералізацыя тарфяніка з выкідамі шкодных рэчываў і вуглякіслага газу. Перыядычна здараліся моцныя пажары. Таму ААН выдзеліла сродкі на вяртанне гэтых земляў у першапачатковы стан. Мы будавалі перамычкі на каналах, каб вада заставалася ў глебе. Потым выконвалі такую ж работу ў Бярэзінскім раёне — перамаглі ў тэндары па забалочванні былой торфараспрацоўкі.

Большасць падначаленых Паўла — дарослыя мужчыны. Але хлопец кажа, што ніякіх праблем з кіраваннем калектывам у яго не было. Самае цяжкае, на яго думку, — працоўны графік. Павел выходзіць на работу з самага ранку (а 7-й гадзіне планёрка), а вяртаецца звычайна толькі позняй вечарам. Нярэдка даводзіцца працаваць і па выхадных. Узімку работы значна менш — толькі высечка кустоў і чыстка каналаў. Сярэдні заробак не самы высокі — каля чатырохсот рублёў. Калі хлопец толькі ўладкоўваўся, плацілі больш, але эканамічныя праблемы не маглі абысці бокам і меліярацыю. Зрэшты, адсутнасць праблемы з жыллём часткова кампенсуе невялікі заробак.

— Цікавага ў рабоце хапае, — кажа хлопец. — У нас у арганізацыі ёсць унікальная тэхніка, досвед працы з ёй будзе вельмі карысным. Ёсць некалькі неблагіх экскаватараў Коханаўскага завода, бульдозеры «Беларус» і незвычайная машына — дрэваўкладчык ЭТЦ. Гэта такі шматкаўшовы экскаватар, які рые траншэі глыбінёй 1,5—2 метры і закладвае туды дрэнажныя трубы. Далёкіх планаў наконт сваёй будучыні я не маю, пакуль што буду працаваць тут, а далей — паглядзім.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by
Мінск — Лагойскі раён — Мінск.

Бачыць мэту

СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ НА ЎСЕ ЧАСЫ,

або Выратаванне з флакона

З больш як трох тысяч супрацоўнікаў Барысаўскага завода медыцынскіх прэпаратаў амаль траціну складае моладзь. Адзін з такіх работнікаў — майстар вытворчага ўчастка Аляксей САЛАВЕЙ, які прыехаў у Барысаў па размеркаванні год таму.

З маладым спецыялістам мы сустракаемся ў новым цэху прадпрыемства, які запрацаваў у канцы мінулага года. Галоўны профіль работы ў корпусе — стэрыльная рассыпка антыбіётыкаў. Па міжнародных стандартах гэты працэс павінен адбывацца ў асобным памяшканні. Менавіта для павелічэння экспарту на заводзе і было прынята рашэнне будаваць новы цэх. Наш візіт пачынаецца з гардэроба, дзе ўсе супрацоўнікі пераапранаюцца ў стэрыльнае адзенне. Абавязковае патрабаванне да некаторых — маскі-рэспіратары і акуляры.

— Я родам са Слуцка, пасля школы паступіў у Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт на факультэт тэхналогіі арганічных рэчываў, — расказвае пра сябе наш герой, пакуль мы надзяваем халаты, шапачкі і бахілы. — Спецыяльнасць выбраў даволі папулярную — біятэхналогія, бо гэта той кірунак, які заўсёды будзе перспектыўным. Патрэба на спецыялістаў, якіх там выпускаюць (а па дыпломе я інжынер-хімік-тэхнолаг), заўсёды высокая. Скажу адразу, што мэтанакіравана хацеў трапіць менавіта ў Барысаў. У гэтага прадпрыемства вельмі добрая рэпутацыя сярод студэнтаў. Многія, са слоў выпускнікоў, ведаюць, што тут дастойныя ўмовы працы і высокія заробкі. Па сярэднім бале дыплома я выбіраў месца размеркавання адным з першых і адразу ж назваў Барысаў.

Месца жыхарства прадаставіў наймальнік. Для маладых спецыялістаў завод выкупіў некалькі кватэр і абставіў іх усім патрэбным для жылля. У адну з такіх і засялілі Аляксея, ён аплачвае толькі камунальныя паслугі. Хлопец з задавальненнем канстатуе, што старэйшыя калегі адразу прынялі яго як свайго. Разам з ім на прадпрыемства прыехала некалькі аднакурснікаў, таму сумаваць не давялося. Больш за тое, ужо праз некаторы час хлопец перавёз у Барысаў сваю дзяўчыну (цяпер жонку), з якой яны вучыліся ў адной групе, — спецыялістку змаглі перараз меркаваць.

— У абавязкі майстра ўваходзіць арганізацыя вытворчасці прэпарата ў самым шырокім сэнсе, — тлумачыць

Аляксей. — Штодзень я павінен праверыць працаздольнасць вытворчай лініі, кожнага яе элемента, а таксама выкананне супрацоўнікамі мер бяспекі. Я кантралюю, каб хапала сыравіны, калі яе нестае — афармляю дакументы на пастаўку. Агулам праца больш папяровая, але вырашаць даводзіцца самыя розныя пытанні. Усяго ў маім падпарадкаванні больш як 80 чалавек. Так, адказнасць вялікая, але гэта кампенсуецца неверагодным досведам працы на самым сучасным абсталяванні і добрым заробкам.

Аляксей праводзіць невялікую экскурсію па памяшканнях цэха, якім ён загадвае. Тут адбываецца стэрыльная рассыпка антыбіётыкаў цэфаласпарынавага рада, якія маюць вельмі шырокі спектр дзеяння. Першае, што кідаецца ў вочы, — шкло, якое аддзяляе пачатак лініі ад астатніх памяшканняў. Заходзіць пабочным асобам туды падчас работы забаронена, усе супрацоўнікі (дазіроўшчыкі) апрануты ў форму, якая хутчэй нагадвае скафандры. Як тлумачыць майстар, тут захоўваецца клас чысціні В. Вышэй за яго толькі клас А — у памяшканнях такога кшталту працуюць выключна робаты.

Усё пачынаецца з падрыхтоўкі флаконаў, якія набываюць у Расіі. Тут іх падаюць у мыечную машыну, дзе яны праходзяць ачыстку вадой пры тэмпературы 90 градусаў. Далей — стэрылізацыя пры тэмпературы 320 градусаў па Цэльсіі. Пасля падыходзіць важнейшы этап — у так званай «зоне» фасовачная машына рассыпае антыбіётык па флаконах ідэальна роўнымі дозамі. Наступны этап — закаркоўванне.

— Усё абсталяванне тут абсалютна новае, італьянскае, — расказвае Аляксей. — Яно вельмі якаснае і «гнуткае»: усяго за суткі мы можам цалкам пераналадзіць лінію на выпуск іншага прэпарата. Тэхніка дазваляе выпускаць каля 250 тысяч флаконаў за дзень. Завод працуе кругласутачна — у тры змены. Для мяне змены чаргуюцца па тыднях — спачатку дзённая, потым вячэрняя і начная.

На кожнай наступнай стадыі ўдзел у вытворчасці бярэ ўсё больш людзей. Далей, напрыклад, да работы прыступаюць кантралёры — яны візуальна правяраюць напоўненасць флаконаў, адбракоўваюць пашкоджаныя. Вага замяраецца аўтаматычна. Напрыканцы шклянкі маркіруюцца, на іх наносяцца серыя і тэрмін прыгоднасці. Апошняя стадыя — упакоўка ў скрыні. Заўважаем рэгіён прызначэння — Узбекістан. Па словах Аляксея, больш за 70% прадукцыі цэха ідзе на экспарт, у асноўным у краіны СНД.

— Уражанні ад працы ў мяне самыя выдатныя, — прызнаецца малады спецыяліст. — Я адчуваю, што расту прафесійна, а гэта вельмі важна. Нядаўна вось прайшоў курсы па павышэнні прафесійнага майстэрства, якія для нас праводзіў спецыяліст з Украіны. Неўзабаве я адпраўлюся на стажыроўку ў Кіеў, туды мяне накіраваў завод. На прадукцыю фармацэўтыкі заўсёды будзе попыт, таму за сваю будучыню я спакойны.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by
Мінск — Барысаў — Мінск.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Вопыт работы на самым сучасным абсталяванні — адна з пераваг прадпрыемства.

Не вучобай адзінай

Права на месца,

ці Каго найперш чакаюць у інтэрнатах

Пры згадванні БДУІР у многіх юнакоў і дзяўчат загараюцца вочы. І не дзіва, бо тут рыхтуюць ІТ-спецыялістаў — прадстаўнікоў прафесіі, запатрабаванай у сучасным свеце. Сёлета на першы курс дзённага аддзялення паступіла больш як 2 100 маладых людзей, 1292 з якіх — іншагароднія. Хто з іх мае шанц засяліцца ў інтэрнат? Як не страціць месца і прасунуцца па чарзе? Чым сустрэне новага жыхара агульны пакой?

Паступаць лепш з братам ці сястрой

У канцы лета на факультэтах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі праглядаюць заявы на жыллё. Пропуск у інтэрнат па-за чаргой атрымаюць студэнты, пацярпелыя ад вынікаў чарнобыльскай аварыі; дзеці-сіроты; тыя, хто ўключаны ў спіс Банка даных адоранай моладзі; інваліды I і II груп. Потым ідзе першая чарга. Яе складаюць маладыя сем'і, замежныя студэнты, курсанты ваеннага факультэта, дзеці са шматдзетных сем'яў, выдатнікі, актывісты грамадскай, культурнай і спартыўнай работы, пераможцы рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд. Цікава, што калі студэнтамі БДУІР становяцца адразу двое дзяцей з адной сям'і, яны таксама трапляюць у пакой інтэрната аднымі з першых. **Начальнік студгарадка БДУІР Анатоль ЛУЦКІ** тлумачыць:

— У нас «ільготнікі» і першая чарга засяляюцца поўнасцю. Астатнія селяцца ў незанятыя пакоі альбо чакаюць, калі з'явіцца вольнае месца. Мы прапаноўваем жыллё студэнтам на ўвесь тэрмін вучобы, аднак кожны год узгадняем з жыллёва-бытавой камісіяй факультэтаў, ці трэба працягваць дагавор. Калі наш падапечны парушае парадак, мае спагнанне, якое вынесена загадам рэктара, яму адмаўляюць у пражыванні.

Сёлета ў інтэрнатах універсітэта вызвалілася толькі каля 500 месцаў. Гэта азначае, што частцы іншагародніх студэнтаў давядзецца шукаць кватэру ў горадзе.

— Намі сабрана спецыяльная база адрасоў, — расказвае **намеснік старшыні прафкама студэнтаў БДУІР Настасся ЛАТУШКІНА.** — Летась там знаходзіліся спасылкі прыблізна на 500 месцаў, дзе гаспадары былі гатовыя ўзяць да сябе кватаранта. Каля 700 студэнтаў скарысталіся гэтай паслугай. Некаторыя засталіся на знятых кватэрах і ў гэтым годзе, некаторыя вырашылі шукаць іншыя варыянты. Сёлета ў базе пакуль 345 адрасоў.

Для малазабяспечаных студэнтаў, якія здымаюць жыллё, існуе яшчэ дзяржаўная кампенсацыя памерам у тры базавыя велічыні, калі гаварыць пра Мінск. Аднак, каб ёй скарыстацца, трэба вучыцца на бюджэтным аддзяленні, мець дагавор арэнды памяшкання і даведку, што сярэднедушавы даход сям'і, у якой пражывае студэнт, не перавышае два бюджэты пражыткавага мінімуму. У БДУІР летась кампенсацыю атрымлівалі толькі тры навучэнцы.

«Кватэра» на пяць чалавек

Усяго ўніверсітэт мае чатыры інтэрнаты. Два з іх першай катэгорыі, так званыя «люксы». У адным блоку знаходзяцца два жылыя пакоі, кухня і санвузел з душавой. Па сутнасці, маленькая кватэра на пяць чалавек. Пражыванне ў такой раскошы каштуе 1,2 базавай велічыні — 25 рублёў 20 капеек. Інтэрнаты другой катэгорыі адрозніваюцца ад «люкса» толькі агульнай кухняй і абыдуцца жыхару ў 0,8 базавай велічыні. У будынках ёсць залы для самападрыхтоўкі, для спартыўных заняткаў, гурткі і клубы па інтарэсах.

Самы стары інтэрнат №1 па вуліцы Якуба Коласа сёлета пераживае бягучы рамонт. Ужо заменены вокны, на кухнях адрамантаваны столі, сцены, падлога, пакладзена плітка, хутка з'явіцца новая мэбля. Рамонт працягнецца і пасля засялення.

— Перш чым яго распачаць, мы апыталі студэнтаў, — інфармуе **намеснік начальніка студгарадка БДУІР па інфармацыйнай і выхаваўчай рабоце Вольга РУТКОЎСКАЯ.** — Выселіць адразу 870 чалавек і хутка завяршыць работы ці аднаўляць будынак паступова. 90 працэнтаў апытаных пагадзіліся цярпець часовыя нязручнасці. Некаторыя студэнты нават прапаноўвалі праекты для пакояў. Часткай з іх мы скарысталіся.

На другім паверсе шматпавярховіка, сапраўды, чуваць гул перфаратара — будаўнікі аббіваюць балконы. Аднак студэнтам грукат перашкаджаць не будзе, пасля засялення застануцца толькі аддзелачныя работы ў пакоях.

Другі інтэрнат знаходзіцца непадалёку, на вуліцы Леаніда Бяды. У 2014 годзе там скончылі капітальны рамонт. Кожнае лета адміністрацыя студгарадка адводзіць адзін інтэрнат для засялення ў летні перыяд удзельнікаў будатрадаў, замежных студэнтаў, моладзі, што займаецца навуковымі праектамі на кафедрах, студэнцкага актыву і інш. Сёлета такім агульным жытлом стала «двойка».

Што трэба рабіць, каб застацца ў інтэрнаце? Асноўныя правілы — падтрымліваць чысціню і не перашкаджаць іншым. Дзяжурыць па паверсе, калі давялося жыць у інтэрнаце другой катэгорыі. Абавязковай застаецца грамадска-карысная праца па добраўпарадкаванні інтэрната, як кажуць у студэнцкім асяродку, «адпрацоўкі». Усяго трэба адрабіць чатыры ўмоўныя гадзіны за месяц. Залічваецца не толькі праца па добраўпарадкаванні інтэрнатаў, але і творчая дзейнасць: дапамога падчас свят, выпуск насценгазеты, удзел у культурных і грамадскіх мерапрыемствах.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.

Цікава, што калі студэнтамі БДУІР становяцца адразу двое дзяцей з адной сям'і, яны таксама трапляюць у пакой інтэрната аднымі з першых.

Даведка:

У 2015/2016 навучальным годзе паказчык забяспечанасці месцамі ў інтэрнатах навучэнцаў установ прафтэхадукацыі складаў 100 працэнтаў, сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 98 працэнтаў, а студэнтаў установ вышэйшай адукацыі — 81 працэнт (па Мінску — 77 працэнтаў). Мелі патрэбу ў засяленні ў інтэрнаты больш як 14 тысяч студэнтаў сталічных ВНУ. А ўсяго па краіне — 20,7 тысячы.

Самая напружаная сітуацыя складвалася ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, БДУІР, Беларускім дзяржаўным універсітэце, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце і некаторых іншых установах адукацыі. Таксама не ўсе студэнты задаволеныя ўшчыльненнем інтэрнатаў, на якое адміністрацыя вымушана ісці з дазволу санітарных службаў. Напрыклад, у БНТУ больш за 2,5 тысячы студэнтаў былі заселены звыш санітарных нормаў.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Як стаць сапраўдным студэнтам?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Старшакурснікі больш сур'ёзныя, а ў тых, хто яшчэ і працуе, проста на лбе напісана: «Гэта маё жыццё, якое я ўладкоўваю сам». Паліна — будучы менеджар-культуролаг. «Не ведаю, як іншым, але мне вучоба не здаецца нечым непад'ёмным, — дзеліцца студэнтка. — Калі ў школе за намі ўвесь час бегалі і прымушалі вучыцца, то цяпер уся адказнасць за ўласную адукацыю кладзецца на цябе. Я прывыкла вучыцца, працаваць над сабой і сваімі памылкамі. Яшчэ важна, каб выкладчык бачыў тваю працу на працягу семестра, тады здаць сесію лягчэй. Дзесьці можна нешта недавучыць па тэорыі, але паказаць свае веды на практыцы. Неад'емная частка студэнцтва — жыццё ў інтэрнаце. Там здорава, калі ты чалавек таварыскі і суседзі ў цябе добрыя. Мне вось пашанцавала і з групай, і з суседкамі: мы хутка пазнаёміліся, але пазнаваць адна адну працягваем да гэтага часу».

«Важна, каб выкладчык бачыў тваю працу на працягу семестра, тады здаць сесію лягчэй. Дзесьці можна нешта недавучыць па тэорыі, але паказаць свае веды на практыцы».

На маё пытанне, як змянілася яе жыццё за гэты год, Паліна адказала, што стала больш самастойнай, бо цяпер за яе ніхто не паклапоціцца пра вячэру ці прыборку. Жыццё ўдалечыні ад бацькоў вучыць адказваць за свае дзеянні і не скідваць адказнасць на іншых. З пераездам зразумела, што любіць свой родны горад, хоча лепш яго пазнаць і ўнесці свой уклад у яго развіццё. Яшчэ аказалася, што яна не любіць гатаваць, але вадой сыты не будзеш, таму давялося вучыцца. «Самастойнае жыццё выдатна дапамагае зразумець, што ўсяму можна навучыцца, трэба толькі захацець», — кажа другакурсніца.

ЗНАЙСЦІ АГУЛЬНУЮ МОВУ

— Першая сесія прайшла як у тумане, — падзялілася сваімі ўспамінамі Дар'я Вараб'ёва, студэнтка факультэта англійскай мовы Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. — Я нават апамятацца не паспела, як яна ўжо была здадзена. Усё было не так страшна, як мне расказвалі. Вучоба — толькі адзін са складнікаў студэнцтва. У нашым універсітэце вельмі шмат гурткоў, секцый, праводзіцца мноства розных мерапрыемстваў, пра якія нам расказалі на першым жа сходзе. Я прымаю ўдзел у дзейнасці валанцёрскага атрада «Мы — дзецям» і тэатра «Разам у казку». Акрамя гэтага, у вольны час гуляю па горадзе, чытаю, сустракаюся з сябрамі. Вядома, я сумую па доме. Жыць адной аказалася больш складана, чым я думала. Цяпер трэба самой вырашаць мноства бытавых пытанняў. Першы час у Мінску прыйшлося здымаць кватэру. Памятаю, як плакала, калі з'ехалі бацькі, і я засталася адна ў пустым пакоі. Потым прывыкла і асвоілася, да мяне часта прыходзілі сябры, так што самотна мне не было. Цяпер жыву ў інтэрнаце. Мне падабаецца, бо побач заўсёды ёсць нехта, хто можа дапамагчы, ёсць з кім пагаварыць і ўрэшце — у каго пазычыць соль ці падручнік.

«НЕ ТРЭБА БАЯЦЦА СЕСІІ»

Кожны год студэнтамі становяцца тысячы выпускнікоў школ. Першы год вучобы — важны этап у жыцці кожнага з нас. Усе па-свойму адаптуюцца да новай ролі: хтосьці лёгка і хутка, а некаму ў гэтым патрэбна падтрымка збоку. «Хто можа дапамагчы першакурснікам асвоіцца ў ВНУ?» — спытала я ў **педагога-псіхолага Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі Вольгі КАЗЛОВАЙ.**

— Іх заўсёды лёгка адрозніць ад астатніх студэнтаў, — гаворыць Вольга Рыгораўна. — Яны выглядаюць трохі збянтэжанымі, з асцярогай заходзяць у кабінет, але, з іншага боку, ім усё цікава. Яшчэ адна асаблівасць: прывыкшы за 11 гадоў да школьнай формы, яны яшчэ паўгода і тут прытрымліваюцца дзелавога стылю ў адзенні, а ўжо пасля першай сесіі пераходзяць на джынсы. Першы год вельмі паказальны, гэта своеасаблівая стартавая пляцоўка. Здольных студэнтаў відаць адразу. Таму трэба не саромецца праяўляць сябе і зарабляць аўтарытэт. Трэба ўліцца ў новы калектыў. Для гэтага неабходна ведаць сабе цану, але і не быць агрэсіўным. Часам здаецца, што на новым месцы ўсё будзе па-іншаму, але насамрэч, калі ў школе былі праблемы праз нізкую самаацэнку ці залішнюю ганарлівасць, то без працы над сабой сітуацыя можа паўтарыцца і ва ўніверсітэце. Бывае такое, што ўчарашнія школьнікі не могуць ужыцца з суседзямі па інтэрнаце або з аднагрупнікамі. Тут ужо прыходзяць на дапамогу старэйшыя таварышы: куратар, выхавальнікі, сацыяльныя педагогі. Разам яны шукаюць прычыну праблемы і імкнуцца яе вырашыць. Я ведаю выпадкі, калі з-за такіх непаразуменяў і недамовак студэнты проста забіралі дакументы з ВНУ.

Многія баяцца сесіі і адчуваюць напярэдадні яе велізарны стрэс. Тут важна не панікаваць, а дакладна паставіць перад сабой задачу і вызначыць шляхі яе рашэння. Кожны выпрацоўвае свой метад падрыхтоўкі: адны «зазубрываюць» тэорыю, іншыя больш увагі надаюць практыцы. Магу сказаць адно — калі рыхтавацца на працягу ўсяго семестра і праяўляць цікавасць да вучобы, то «валіць» вас на экзамене ніхто не стане.

...Я студэнтка. Наперадзе ў мяне чатыры гады, каб пасталець, стаць спецыялісткай у выбранай сферы, той, кім хочуць бачыць мяне бацькі і кім я — сама сябе. А пакуль я ўсяго толькі студэнтка...

Арына КАГАЛЁНАК,
студэнтка II курса Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
1 09 2016 г.

Акордамі душы

Нью-эйдж для скрыпкі, ці Магія са смычком

Студэнты музычнага каледжа імя М.І. Глінкі стварылі інструментальны бойз-бэнд «DANAND». Хлопцы іграюць у стылі нью-эйдж, які спалучае элементы электроннай і этнічнай музыкі. Гэта меладычныя, нетанцавальныя кампазіцыі з рознымі відамі аранжыровак. Сёння групу складаюць два скрыпачы, але надалей яна будзе пашырацца. Данііл КУЛІКОЎСКІХ, кампазітар і ідэйны натхняльнік групы, расказаў «Чырвонцы. Чырвонай змене» пра сваё захапленне і творчыя планы.

— Схільнасць да музыкі заўважыла ўва мне маці, калі я «найграваў» нешта на алоўках, пераймаючы манеры скрыпача. Для музычнай школы я быў яшчэ замалы, таму прынялі рашэнне браць прыватныя ўрокі. Калі мне споўнілася шэсць гадоў, я змог працягнуць навучанне ў спецыялізаванай установе. У гэты ж перыяд напісаў свой першы музычны твор. Часу катастрафічна не хапала: з адной школы прыходзілася бегчы ў другую, хапаючы на хаду прадбачліва прыгатаваную мамай ссабойку. А вечарам, стомлены, я праходзіў каля разгарачанай ад гульняў дзятвы і праклінаў усё на свеце. На шчасце, побач заўсёды былі бацькі, якія знаходзілі патрэбныя словы падтрымкі, што надавалі сілы ісці далей.

— Што для цябе з'яўляецца крыніцай натхнення?

— Я чую музыку паўсюдна. Магу проста ісці па вуліцы, пачуць стук абцасаў і ў галаве народзіцца мелодыя. А потым еду ў аўтобусе і занатоўваю. Я лічу, што натхненне — гэта ўменне бачыць у чарадзе дзён магію жыцця. І гэтаму трэба вучыцца. Кожны дзень мы становімся сведкамі цудаў, але шукаем іншых дэкарацый для шчасця. Натхненне — у простых рэчах. У шалясценні травы, промнях сонца, форме аблокаў, а яшчэ... у сустрэтых людзях.

— Калі прыйшло разуменне, што тое, чым займаешся, цікава не толькі табе, але і іншым?

— Неяк у мастацкім музеі мы рэпетыравалі праграму да дабрачыннага канцэрта. Кіраўніцтва выдзеліла нам адзін з адкрытых балконаў. Калі паліліся першыя гукі музыкі, да таго месца стаў падцягвацца народ і скончылася ўсё невялікім міні-канцэртам, нам апладзіравалі. Час ад часу мы з сябрамі граем у падземных пераходах. Не дзеля заробку, не, хутчэй для душы. Людзі падыходзяць да нас, цікавяцца стылем музыкі, выказваюць задавальненне.

— Чыя творчасць блізкая табе па духу?

— Мяне захапляе Ханс Цімер — выдатны кампазітар сучаснасці, які напісаў саўндтрэкі да такіх фільмаў, як «Чалавек дажджу», «12 гадоў рабства» і іншых. Я планую развівацца ў тым жа кірунку. Нядрэнную музыку піша фінская група «Апакаліпціка», якая выконвае «метал» на віяланчэлях. Наогул, я стараюся як мага менш... слухаць музыку. Былі сітуацыі, калі ў галаве круцілася пэўная мелодыя, мне здавалася, што яна мая, а аказвалася, што такое ўжо ёсць у іншага аўтара.

«Я чую музыку паўсюдна. Магу проста ісці па вуліцы, пачуць стук абцасаў і ў галаве народзіцца мелодыя. А потым еду ў аўтобусе і занатоўваю».

— Раскажы пра свой вопыт кампазітара?

— Цяпер я выступаю ў асноўным як выканаўца, але ж хацелася больш часу прысвячаць складанню музыкі. Гэтая цяга да напісання ўласных твораў у многім стала вызначальнай для мяне. Так, распаўся гурт «EVAND» — маё першае дзецішча, якое праіснавала ўсяго год, бо не сышоўся ў поглядах на творчасць з іншымі ўдзельнікамі. Яны хацелі рабіць кавер-музыку (выконваць існуючыя кампазіцыі на новы лад), якая больш прыбытковая ў грашовым плане, але істотна абмяжоўвае магчымасці творцы.

— Над чым ты зараз працуеш?

— Разам з маім калегам Андрэем Ходасам, другім удзельнікам групы, я запісваю свой першы аўтарскі альбом, у які ўвойдуць дзевяць кампазіцый. Адну з іх я напісаў ва ўзросце 12 гадоў. А ўсяго іх у мяне каля 150. Некаторыя былі ўзяты ў рэпертуар нашага студэнцкага аркестра. Нядаўна на мяне выйшла расійская спявачка, якая папрасіла напісаць музыку да яе песні. А яшчэ працую над агучваннем спектакля «Крылы адны» ў псіхалагічным тэатры «Лютэя».

— Ці былі ў вас ужо гастролі?

— Падчас навагодніх свят мы выступалі ў Рызе на прыватных вечарынах. Ёсць магчымасць выхаду на замежныя эксперыментальныя музычныя пляцоўкі, таму будзем старацца заявіць пра сябе і там.

Алена ЯКАВЕНКА.

Роля з жыцця

«ЭКСПЕРЫМЕНТ»: СЫГРАЦЬ САМІХ СЯБЕ

Выхаванцы мінскай дзіцячай школы тэлевізійнага майстэрства і журналістыкі пры «Тэлестудыі Новы горад» зняліся ў кароткаметражным фільме «Эксперымент». Карціна прысвечана праблеме залежнасці падрастаючага пакалення ад тэхналагічных і камп'ютарных навінак. Сюжэт пабудаваны на аснове матэрыялаў рэальнага эксперыменту, праведзенага псіхолагамі Санкт-Пецярбурга. Сцэнарый да фільма напісала член Саюза кінематаграфістаў, выкладчык Акадэміі мастацтваў Алена Турава.

Падчас здымак.

...Удзельнікам выпрабавання было прапанавана правесці восем гадзін у адзіноце, самнасам з сабой, не карыстаючыся інтэрнэтам, тэлефонам, не ўключаючы камп'ютар або іншыя гаджэты, а таксама радыё і тэлевізар. Усе астатнія заняткі — чытанне, маляванне, музіцыраванне, прагулкі — дазваляліся. Пры з'яўленні сімптомаў трывожнасці, страху, млоснасці неабходна было спыніць эксперымент і зафіксаваць свае адчуванні на камеру. З сямі чалавек да канца дайшоў толькі адзін, ды і той выпадкова — захрас у ліфце. А само заданне, якое здавалася лёгкім, праз пэўны час уводзіла дзяцей у стан панікі. Яны пачынаюць разумець, якую глабальную ролю адыгрываюць у іх жыцці тэхнічныя прылады і як дрэнна яны ведаюць саміх сябе.

— Сёння мы назіраем адарванасць нашых дзяцей ад рэальнага свету. Ім цяжка ісці на кантакт з аднагодкамі, планаваць свой час. Калі нас раней было і пугай не загнаць у дом, так весела было бавіць час у двары ў кампаніі іншых дзяцей, дык зараз мы назіраем адваротную сітуацыю. Даводзіцца прыдумляць нагоду дзеля таго, каб выправадзіць дзіця з кватэры. Даступнасць інфармацыі негатыўна адбіваецца на памяці школьнікаў. Яны не зацікаўлены ў пошуку дакладных звестак, а проста націскаюць на кнопку «мышкі» і адразу маюць адказ, — лічыць **Людміла КАНАПЛЯНІК, дырэктар «Тэлестудыі Новы горад».**

З юнымі акцёрамі працавалі таленавітыя педагогі і майстры сваёй справы — Алена Турава, Ірына Клёнава (вядучая на радыё «Мір»), Іван Пінігін (рэжысёр і тэлепрадзюсар), Ігар Пятроў (акцёр Купалаўскага тэатра) і іншыя.

Выкананы ў жанры ігравога кіно, праект стаў міжнародным. У здымках фільма прынялі ўдзел маскоўскі псіхолаг Міхаіл Казлоў і французская актрыса Дальфін Аэртон. На апошнюю выйшаў ужо згаданы Ігар Пятроў, які курыруе групу французскіх акцёраў-стажораў на базе тэатра Янкі Купалы.

Здымкі доўжыліся пяць дзён, рабочая змена была па 12 гадзін, але гэты этап ужо пройдзены. Наперадзе мантаж, графіка, гуказапіс.

У планах каманды энтузіястаў — прэзентацыя фільма ў эфіры беларускага тэлебачання (каналы «Беларусь 1», «Беларусь 2», «Беларусь 3») і на міжнародных фестывалях у Чэхіі, Вялікабрытаніі, Італіі, у наступным годзе — у Чыкага. Летась з відэаролікам «Ачысцім планету ад смецця» (на Youtube запушчаны канал «Pro ekran», дзе можна паглядзець усе работы тэлестудыі) выхаванцы тэлешколы занялі першае месца на экалагічным фестывалі ў Браціславе (Славакія) у намінацыі «Дзіцячае і юнацкае кіно».

— У фільме мне выпала роля Ганны, — **расказвае 13-гадовая актрыса Вераніка ШЫЛКОЎСКАЯ.** — Не зважаючы на захламленасць уласнага пакоя, дзяўчына днямі ўглядаецца толькі ў экраны гаджэтаў. Пагаджаючыся на ўдзел у эксперыменце, яна плануе прывесці ў належны выгляд асабістае памяшканне, што ўяўляецца ёй вельмі простым. Але ўжо ў першую гадзіну выпрабавання дзяўчыну ахоплівае трывога, пачуццё бездапаможнасці і крыўды. Яна пачынае «заядаць» уласныя перажыванні. Для мяне гэта была самая цяжкая і адначасова камічная сцэна. Патрэбна было паказаць сапраўднае абжорства, ежу даводзілася літаральна запіхваць у сябе.

Алена ЯКАВЕНКА.

ДАВЕДКА

У эксперыменце, які праводзілі санкт-пецярбургскія псіхолагі, прынялі ўдзел 68 падлеткаў ва ўзросце ад 12 да 18 гадоў: 31 хлопчык і 37 дзяўчынак. Давялі эксперымент да канца (гэта значыцца, восем гадзін прабылі сам-насам з сабой) толькі трое падлеткаў: два хлопчыкі і дзяўчынка. Сямёра вытрымалі пяць (і больш) гадзін. Астатнія — менш. Прычыны спынення эксперыменту падлеткі патлумачылі наступным чынам: «Я больш не мог», «Мне здавалася, што я зараз выбухну», «У мяне галава лопне». У дваццаці дзяўчынак і сямі хлопчыкаў назіраліся прамыя вегетатыўныя сімптомы: прылівы жару або дрыжыкі, галавакружэнне, млоснасць, сухасць у роце, трэмар рук ці вуснаў, боль у жываце ці грудзях, адчуванне «варушэння» валасоў на галаве.

Камертон настрою

Загадка «электроннай прынцэсы»

Музыка Mustelide гучыць і ў Маскве, і ў Нью-Ёрку. За гэтым псеўданімам хаваецца Наталля КУНІЦКАЯ, якая сёлета выпусціла новы альбом і аб'ездзіла з канцэртамі амаль паўсвету. Свой сольны праект яна пачала некалькі гадоў таму і амаль адразу атрымала тытул «Электроннай прынцэсы Беларусі».

— Як вы да яго ставіцеся?

— З гумарам. Сама б сябе я так, вядома, не назвала — гучыць пафасна і нясціпла. Узнагародзілі мяне гэтым тытулам хлопцы з суполкі беларускай электроннай музыкі «Grave Board Clan», а іншыя СМІ падхапілі.

— Сёлета выйшаў новы альбом «Spi». Чым ён адрозніваецца ад папярэдняга «Secret»?

— У першую чаргу ў падыходзе да работы над гукам. У мяне з'явілася больш вопыту і смеласці, захацелася выйсці за рамкі і даць волю падсвядомасці. Таму гэтую музыку можна параўнаць са снамі, непрадказальнымі і, магчыма, вар'яцкімі. Але песні напісаныя не для таго, каб збегчы ад штодзённасці, яны, хутчэй, дапамагаюць зірнуць на звыклыя рэчы па-іншаму. Гэта быццам «музычныя рэчывы», якія не шкодзяць здароўю, але змяняюць свядомасць.

— Адкуль з'явілася ідэя зняць відэа на загалоўную песню з дзіцячымі кашмарамі?

— Генератар усіх ідэй кліпа — яго рэжысёр Віталь Сідарук. Гэты таленавіты аніматар славіцца сваёй любоўю да ўсяго жудаснага. У, здавалася б, мяккай і наіўнай песні «Spi» ён разгледзеў гэтакі цёмны бок і вырашыў прадставіць яго гледачу.

«Маю музыку можна назваць стылем «сінтыпух», дзе спалучаецца сінтэтычная жорсткасць і жаноцкая «пушыстасць». Увесь гук атрымліваю з аналагавых сінтэзатараў».

— З новым альбомам вы адыгралі некалькі канцэртаў у Нью-Ёрку. Як вашу музыку прымалі ў Амерыцы?

— Нечакана цёпла. Я заўважыла, што там людзі шчодрыя на кампліменты і актыўныя на водгукі. Таксама радуе, што руская мова маіх песень не адштурхоўвае, а, наадварот, прыцягвае. Штампы ў наш час мала каму цікавыя, а англійская мова — па вялікім рахунку — таксама штамп. Калі людзі чуюць нязвыклае маўленне, і гэта не фолк, а нешта актуальнае, яно прыцягвае нашмат больш цікавасці і ўвагі.

— А ці можна айчынным выканаўцам вылучыцца на замежнай сцэне, наадварот, за кошт народных матываў?

— Толькі выкарыстоўваючы народныя элементы — складана. Але калі гэта будзе аб'ектыўна «круты» прадукт з магутным прамоўшэнам, калі ён выдатны і стыльны, то тады зацікавіць і сусветную сцэну. Сам па сабе беларускі фолк мала каму цікавы. Цяпер вітаецца максімальная інтэграцыя: народныя матывы павінны пісьменна спалучацца з сусветнымі тэндэнцыямі.

— Да якога стылю вы адносіце сваю творчасць? У музыкі незвычайнае гучанне. Як запісваеце свае песні?

— Маю музыку можна назваць стылем «сінтыпух», дзе спалучаецца сінтэтычная жорсткасць і жаноцкая «пушыстасць». Увесь гук атрымліваю з аналагавых сінтэзатараў. Мой любімы — гэта «Prophet'08». У яго вельмі харызматычнае гучанне, усё на ім можна сінтэзаваць самастойна, дамагаючыся тым самым унікальнага саўнда. А запісваю і зводжу потым у праграме «Ableton».

— У выступленнях вы выкарыстоўваеце шмат візуальных эфектаў...

— У маім выпадку гэта вельмі важны элемент. Але я яшчэ працую над візуальным шоу. Тое, што паказваю цяпер, рабіла самастойна або з дапамогай сяброў.

— І запісам, і прасоўваннем праекта таксама займаецеся самі?

— Прадукт стварaю ў адзіночку. Мне так больш зручна і цікава. Сёння гэтую частку працы артыст можа выконваць сам. Наяўнасць у камандзе менеджара становіцца лагічнай, калі запатрабаванасць і, адпаведна, занятасць выканаўцы расце. Яму патрэбна дапамога, каб заставаўся час на музыку. Менавіта таму, пачынаючы з выхаду другога альбома, з менеджментам, букінгам і прома мне сталі дапамагаць прадстаўнікі лэйбла «SunWoofer» Аляксандр Бергер і Яўген Калмыкоў.

— У чым сакрэт псеўданіма Mustelide?

— Тут зашыфравана некалькі сэнсаў, адгадаць якія — задача маіх слухачоў. Я люблю загадкі.

— Калі вас чакаць з канцэртам на радзіме?

— У Беларусі часта іграць не атрымліваецца з-за маіх пастаянных раз'ездаў. Але я планую восенню зладзіць вялікі канцэрт у Мінску.

Надзея АНІСОВІЧ.

Друкуецца ў «Маладосці»

Пачатак гэтай аповесці ўжо надрукаваны ў «Маладосці» — чытачы захапіліся ім у сярэдзіне лета. Але толькі напачатку восені чакаецца развязка. Зрэшты, тут прапанавана невялікая частка працягу захапляльнай гісторыі пра беларускага Шэрлака Холмса з XVI стагоддзя, прыдуманая (а мо і не!) пісьменнікам Ягорам Коневым. Гісторыя пра Андрэя Станкевіча, шкаляра факультэта вольных мастацтваў аддзялення філасофіі. Спякотным чэрвеньскім поўднем 1570 года ён даведаўся пра тое, што здарылася з грэшнай душой прафесара Прудэнціуса, і паспяшаўся туды, куды наведваўся Д'ябал. А што было далей? Ці, можа, разгадка ў тым, што было раней?.. Няхай чытач распаліць сваю цікавасць.

Ягор КОНЕЎ

АНДРЭЙ СТАНКЕВІЧ І ТАЕМНАЕ МАСТАЦТВА

Два ўрыўкі з адной аповесці

* * *

Насамрэч Якаб Прудэнціус рэдка дазваляў сабе шчырасць і шматслоўнасць. У яго доме на Грунэрштрасэ часцей пераважала цішыня. Звычайна гаспадар моўчкі сілкаваўся, чытаў, пісаў, кідаў памочніку кароткія загады. З надыходам вечара Прудэнціус і Андрэй спускаліся ў лабараторыю, дзе прафесар таксама не вызначаўся красамоўствам. Ён вывучаў уласныя запісы і старонкі кніжак, кідаў распараджэнні і мог маўчаць гадзінамі, чакаючы выніку эксперыменту. Затое, калі ўсе практыкаванні аказваліся марнымі, то лаяўся гучна.

Асабліва абуралі яго тэксты, якія гучалі як расшыфраваныя парады Гермеса Трысмегіста, але на праверку аказваліся метафарамі. Напрыклад, аднойчы Прудэнціус вычытаў у ананімным трактаце пад назваю «Дамова нябеснай прасторы з зямною» параду: «На сыходзе сонца шукай схаваную серу. На чыстым агні экстрагіруй брудную сумесь, злучы яе з недасканалай ртуццю, дадай лятучай солі і ўсё дыгерыруй. Пры гэтым нізавошта не думай пра чорнага цмока».

Прафесар дбайна ўзяўся за справу ды раптам перарваў яе і вылаяўся:

— Хіба можна не думаць пра чорнага цмока?.. Гэта алхімічны жарт!

Станкевічу, у якога ад стомы пот струменямі сцякаў са спіны, той жарт падаўся зусім не смешным.

Рэцэпт у кнізе пад назвай «Таемны агонь Мудрасці» рэкамендаваў «ажаніць стары метал і маладую соль, змяшаць з цынкавым пылам і каламінам, дыгерыраваць да жоўтага адцення, і праз тры ночы ён куагуліруецца ў крохкі сродак». Старанна выканаўшы гэтую параду, прафесар і Андрэй атрымалі рэчыва, ад якога абодва расчыхаліся.

— Як я не сцяміў, што гаворка ідзе зусім не пра сапраўдныя рэчы? — буркнуў Прудэнціус, выціраючы ўзмакрэлы твар.

— А пра што? — здзівіўся Станкевіч.

— Пра ўнутраны стан чалавека немаладога веку, які надумае ажаніцца з маладзіцай. Твор папярэджвае пра вынікі няроўнага шлюбу, пра нервовыя ўзрушэнні, якія перажывуць абодва ўдзельнікі працэсу.

— А прасцей пра гэта нельга было напісаць? Абавязкова трэба зашыфроўваць відавочныя рэчы ў сімвалы?

— А хто пагодзіцца чытаць кнігу, у якой гаворка пойдзе пра людскія стасункі? Каму гэта цікава?

— Ну, мне, дарэчы, — нясмела прызнаўся юнак.

Прафесар прыгразіў Станкевічу кулаком, паўшчуваў:

— Не вярзіце лухту! У чалавека мусіць быць адна дарога па жыцці — патрапіць пасля смерці ў царства нябеснае. Толькі ўчынкі, якія вядуць туды, маюць значэнне. Гэта дакладная колькасць грошай, якія трэба змарнаваць на міласціну, малітваў, якія трэба прачытаць, зарокаў, якія належыць выканаць... А ўсе чалавечыя забабоны, якія замінаюць шляху з зямнога ў нябеснае, не заслугоўваюць сур'ёзнай увагі!

Станкевічу хапіла розуму прамаўчаць, хоць ён і не пагадзіўся з гаспадаром. Юнак падумаў пра тое, што вычварнасць і мудрагелістасць людскіх паводзінаў варта вывучаць. Бо пакуль людзі, маўляў, патрапяць у райскія шаты або ў пекла, яны шмат чаго ўчыняць у зямным жыцці! А яшчэ Андрэя бянтэжыла безапеляцыйнасць прафесара, які толькі ўласную думку лічыў бездакорнай. Можа, таму многія ідэі ў Андрэя часта нараджаліся не паводле, але насуперак заявам старога земляка...

Засмучала Станкевіча і тое, што ён не высыпаўся па начах, а ўдзень не меў ані хвіліны для адпачынку. Адвечная стома адбілася на поспехах у вучобе. Дакладней, на іхняй адсутнасці.

За першыя тры месяцы навучання Станкевіч паспяхова здаў трывіум — экзамены па граматыцы, рыторыцы і метафізіцы, за што атрымаў статус філосафа. А вось за апошні год аніяк не мог адолець квадрыум — праваліў іспыты па арыфметыцы, геаметрыі, музыцы і астраноміі.

Напружанасць паміж прафесарам і асістэнтам завяршылася ў пачатку сакавіка 1570 года ўзрушэннем.

Прыбіраючыся ўвечары ў кабінеце, Станкевіч незнарок праліў чарніла на вокладку кнігі «Сапраўдны скарб чалавечага існавання».

Яго няўклюднасць нечакана моцна раззлавала гаспадара.

— Кошт кнігі роўны майму паўгадавому заробку! — роў Прудэнціус. — Кошт яе зместу наогул неацэнны!

Настрой у прафесара тою парой быў выключна благі. Пэўна, таму, што апошнім часам аніводны эксперымент не завяршаўся ўдала. Прызнаць, што ўсяму віной уласная ўпартасць, гаспадару было цяжка, а вось спагнаць злосць на асістэнце — лягчэй.

Накрычаўшыся, Прудэнціус стрымана мовіў юнаку:

— Ад гэтай хвіліны я вызваляю вас ад вашых абавязкаў, шкаляр. Яны вам не пад сілу. Наша дамова скасавана. Зараз жа вымятайцеся ўпрочкі.

Ачмурэлы ад такой несправядлівасці, Станкевіч пабрыў у кладоўку, хутка сабраў там свае рэчы ў торбу і сышоў з дому, пакінуўшы дзверы расчыненымі. Бы ап'янелы, тэпаў ён, гайдаючыся, да інтэрната цёмнымі вулкамі. Час ад часу дарогу яму перагароджвалі нацягнутыя ўпоперак ланцугі — гэтак рабілася, каб коннікі не гойсалі па бруку ды не тапталі ў цемры прахожых. Станкевіч на карачках пралазіў пад ланцугамі, якія мацаваліся да крукоў на сценах дамоў, і не адчуваў ані стылага каменя, ані зябкага начнога ветру.

Крыўда спапяляла розум хлопца. Юны мянянін яшчэ не разумеў, што сёння ён дасягнуў вышэйшай ступені навучання — таго моманту, калі адэпт сыходзіць ад настаўніка ў самастойную дарогу.

* * *

У сінечы неба кружылі ластаўкі. Ад жніўеньскага ветру трапятала лістота на галінах ліп, якія раслі абапал могілак. Кнайпхофскі люд хавалі тут — на паўночным беразе Прэгеля, на паўдарозе паміж Крамным мостам і лобным месцам.

Станкевіч заявіўся сюды пасля поўдня, адслухаўшы службу ў саборы. Юнак брыў сцяжынкай, якая пятляла між каменнымі ды жалезнымі плітамі. Надмагільныя помнікі яскрава сведчылі аб саслоўнай прыналежнасці тых, хто спачыў. Жалезны крыж — пра пахаванне заможнага месціча. Каменная чара — духоўнай або вучонай асобы. Выява Святога Іаана — гандляра або чыноўніка. А сціплы насып над магілай азначаў, што ў сваякоў нябожчыка бракуе грошай на помнік.

Пасярод квадрата могілак узвышаўся белацагляны асарыум — будынак з вялізным сутарэннем. Кожныя трынаццаць гадоў сюды зносілі косці са старых могілак і пасля памінальнай службы скідалі ў яміну. Такім чынам вызвалялася месца для новых пахаванняў.

На могілкі юны ліцвін прыйшоў не толькі каб падумаць пра свой далейшы лёс, але і з тае нагоды, што гэтым днём споўніўся сарокавы дзень пасля смерці Якаба Прудэнціуса. Станкевіч лічыў сваім сумленным абавязкам памаліцца за спачын хрысціянскай душы.

Насып на магіле прафесара метафізікі ўвенчвала шэрая пліта, на якой былі выбіты імя, прозвішча, пасада нябожчыка і лаканічная эпітафія: «На шляху да мудрасці спасцігнуў шмат таямніц быцця».

«І ніякай згадкі на тое, што ён быў ліцвінам, — падумаў Станкевіч. — Такая, відаць, спрадвечная наканаванасць маіх таленавітых землякоў: узбагачаць сваімі здабыткамі чужы народ і быць забытымі на Бацькаўшчыне...»

Памаліўшыся, Станкевіч прысеў на край магільнай пліты.

Гнятлівыя думкі вярэдзілі юнака.

Непакоіла тое, што працэс над выкрытым забойцам адцягваецца. У Альфрэда фон Зітцэра адшукаліся радавітыя абаронцы, якія займалі ўплывовыя пасады ў Кёнігсбергу. Ім здавалася нясцерпнай сама думка, што арыстакрата выраклі на смерць доказы, здабытыя прасталюдзінам. Нанятыя імі адвакаты аспрэчылі ўсе здабытыя ўлікі і вынік боскага суда. Акрамя таго, знайшліся сведкі, якія паклёпніцкі, нібыта Зітцэр ані ў чым не прызнаўся ў дворыку Рэктарыума — ані ў забойстве Прудэнціуса, ані ў нянавісці да «чорнай косці» ў навуцы. На падставе такіх важкіх довадаў адвакаты засыпалі магістрат Кнайпхофа апеляцыямі, патрабуючы, каб суд над Зітцэрам адбыўся ў Кёнігсбергу — маўляў, толькі такім чынам можна дамагчыся юрыдычнай непрадузятасці.

Юстыцрату Карлу фон Кросбаху падкінулі ананімны ліст, у якім яму дакляравалася ўзнагарода ў семсот талераў, калі адпусціць Зітцэра на парукі. У адваротным выпадку гарантаваўся нож у спіну начной парою.

Магістрат Кнайпхофа дзейнічаў, як звычайна, — адтэрміноўваў канчатковае вырашэнне канфліктнага пытання: на просьбы кёнігсбергскіх адвакатаў не пагаджаўся, але і суд над Зітцэрам не распачынаў.

Юстыцрат Кросбах дапускаў, што забойцу ўрэшце перавязуць у Кёнігсберг, дзе верагодна, амністуюць указам герцага. Дык на ананімныя абяцанку і пагрозу адрэагаваў на свой лад — загадаў перавесці зняволенага Зітцэра з сутарэння ў падземную камеру ды скаваць яму рукі і ногі калодкамі. На такую глыбіню не траплялі ані сонечны прамень, ані свежае паветра. Вязні дыхалі вільгаццю, а па халодных сценах струменіліся ручаіны. Сюды саджалі самых злосных нягоднікаў, і менш чым праз паўгода арыштант або рабіўся сляпым калекам, або яго выносілі адсюль нагамі наперад.

Адзін Бог цяпер ведаў, які лёс напаткае Зітцэра — сканае ў падзямеллі да суда або ўсё ж дачакаецца вызвалення? Станкевіч меркаваў, што добрага Прудэнціуса наўрад ці парадавалі б пакуты яго забойцы. Крыўдна, што ў нягоднікаў болей абаронцаў, чым у сумленных людзей. І ўсё ж, мажліва, не строгасць пакарання, а яго непазбежнасць — вось што ўкараніць у людзях веру ў справядлівасць...

Знерухомеўшы, бы надмагільны помнік, Андрэй Станкевіч разважаў і пра тое, што лёс звёў яго з Якабам Прудэнціусам, каб хлопец з цягам часу ўвасобіў галоўны пастулат Таемнага мастацтва — трансфармацыю. Зразумела, справа датычыцца не фізічнай трансфармацыі жалеза ў золата або ў філасофскі камень, але духоўнай — пераўвасабленне ўласных заган у вартасці. Алхімік Прудэнціус для сваіх эксперыментаў ужываў разнастайныя рэчы — ад гліны да серабра. Мяняніну Станкевічу дапаможа бадай што нястомная воля.

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ ЧЫРВОНКА

Вялікае пачынаецца з малога

Пад такім дэвізам напярэдадні новага навучальнага года на першым паверсе ўнівермага «Гомель» прайшла дабрачынная акцыя «У школу з Добрым Сэрцам».

Яе мэтай быў збор канцылярскіх прылад, спартыўнага інвентару для дзяцей-сірот і дзяцей з малазабяспечаных сем'яў. Арганізавалі і правялі акцыю валанцёрскі атрад «Эдэльвейс» Гомельскай абласной арганізацыі БРСМ, актывісты Цэнтральнай раённай арганізацыі БРСМ і член праўлення Добрушскага раённага дабрачыннага аб'яднання «Надзею — дзецям». Усяго было сабрана канцтавараў на суму больш за 500 дэнамінаваных рублёў, а таксама тры партфелі з канцтаварамі для першакласнікаў. Учора апошнія былі ўручаны дзецям з малазабяспечаных сем'яў Добруша. Кожнаму, хто прыняў удзел у акцыі, валанцёры падрыхтавалі сюрпрызы — сэрцы з лагатыпам валанцёрскага руху БРСМ, на якім дзеткі з дзіцячых дамоў вобласці пакінулі свае словы падзякі.

Рэспубліканская дабрачынная акцыя «У школу з Добрым Сэрцам» стартавала 1 жніўня. У яе рамках валанцёрскія атрады БРСМ «Добрае Сэрца» арганізуюць збор канцылярскіх і спартыўных прылад да новага навучальнага года для дзяцей з малазабяспечаных сем'яў і дзяцей-сірот. У Гомельскай вобласці з пачатку правядзення акцыі першакласнікам ужо ўручана больш за 60 партфеляў, сабрана канцылярскіх прылад на суму больш чым 3 000 дэнамінаваных рублёў. Дабрачыннае мерапрыемства прадоўжыцца да 15 верасня. Далучайцеся, нераўнадушныя! Калі вы хочаце дапамагчы падрыхтаваць дзетак, якія маюць у тым патрэбу, да школы, звяртайцеся ў пункты збору, якія арганізаваныя ва ўсіх тэрытарыяльных і раённых камітэтах БРСМ.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
1 09 2016 г.

SEX=БАЛЯСЫ

У КОЖНАГА СВОЙ РЫА

Адгучалі апошнія акорды Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанейра, крыху суцішыліся эмоцыі... Аднак нядаўнія падзеі па-ранейшаму на слыху. Нехта згадвае найперш рэкорды і пераможцаў. У кагосьці настрой дагэтуль азмрочаны допінгавымі скандаламі і правальнымі выступленнямі. («Каментатар: «Наша зборная ўпэўнена гуляе ў сваю гульню... А трэба было б у футбол...»). У любым выпадку ўсе мы былі і застаёмся датычнымі да Алімпіяды, няхай сабе і большасць — толькі ў якасці гледачоў і балельшчыкаў. («Калі наш чалавек набывае спартыўны касцюм, ён або збіраецца на прыроду, або кладзецца ў бальніцу»). Спартыўныя спаборніцтвы — заўсёды відовішчны занятак. Натрэніраваныя целы, моцная харызма патэнцыяльных пераможцаў невыпадкова ва ўсе часы надавалі атлетам яшчэ і сексуальнасці. Што казаць, у старажытнасці спартсмены выступалі ўвогуле аголенымі. Сучасныя тэхналогіі ў экіпіроўцы, у форме — у барацьбе за кожную секунду, кожны сантыметр — таксама надаюць знешняму выгляду атлетаў пэўную прывабнасць. А часам, наадварот, могуць сыграць са спартсменамі злы жарт. Ды і самі алімпійцы... Нехта заслужана застанецца ў нашай памяці дзякуючы сваім рэкордам. А камусьці гульні таксама падарылі хвіліну славы, але зусім з іншай нагоды...

Яшчэ да пачатку Алімпіяды ў Рыа ў сеціве гулялі фотаздымкі мужчын-плыўцоў, абмазаных з ног да галавы пенкай для галення. І наступныя — з канчатковым вынікам пасля працэдуры. («Ты чаго не голішся?» — «Няма ў мяне дзяўчыны, для якой хацелася б пагаліцца...» — «А для сябе?» — «А для сябе я піва купляю».) У лёгкай атлетыцы і плаванні ўсё вырашаюць сотыя долі секунды. Для перамогі даводзіцца пазбаўляцца не толькі ад лішніх кілаграмаў, але і ад валасоў на целе. У прынцыпе, ніякай навіны тут не было: голяцца як мужчыны, так і жанчыны ўжо даўно. Папулярнасць здымкі набылі дзякуючы крыху з'едлівым каментарыям, маўляў, чэмпіёны таксама плачуць, калі робяць дэпіляцыю.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Далей, ужо падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця Алімпіяды, стадыён і сацыяльныя сеткі «парваў» спартсмен з Каралеўства Тога, які нёс сцяг сваёй краіны. Таэквандыст з рэльефнай мускулатурай выйшаў перад гледачамі і ўдзельнікамі іншых камандаў у самым арыгінальным, як яго тут жа назвалі, касцюме. Атлет быў у нацыянальнай цыноўцы, якая нагадвае спадніцу і... усё. Торс спартсмена быў абмазаны масажным алеем, што таксама парадзіла жарты. «Уніформа — масажны алей, проста масажны алей», — пісалі ў сеціве. Што ж, такі касцюм мог дазволіць сабе толькі жыхар астравоў з цёплым кліматам. (На курорце. «Дзяўчына, а пойдзем ноччу голымі купацца?» — «Вой, а я плаваць не ўмею». — «А мы і не будзем!») Дарэчы, члены нашай каманды ва ўніформе з элементамі нацыянальнага арнаменту таксама выглядалі сексуальна...

Затым быў кур'ёзны выпадак з японскім скакуном з шастом. Ну, для журналістаў і зноў жа карыстальнікаў сацыяльных сетак. Сам спартсмен напачатку пакрыўдзіўся, хоць потым сказаў, што ўспрыняў сітуацыю з гумарам. Атлет, як вырашылі некаторыя, не прайшоў у фінальную частку алімпійскіх спаборніцтваў быццам бы з-за таго, што падчас скачка збіў планку сваім... прычынным месцам у «заведзеным» стане. («Мама, чаму ты не пастукала перад тым, як увайсці ў мой пакой?» — «Праз замочную шчыліну было відаць, што зараз можна ўвайсці і без стуку».) Праўда, потым спартыўны эксперт патлумачыў, што такое ўражанне магло скласціся праз няўдалы ракурс здымак, насамрэч атлет збіў планку нагой і рукой. Скажыце, ці запомніўся б гэты алімпіец, каб не гэты трагікамічны выпадак? («Ніколі не гавары: «Я памыліўся». Лепш казаць: «Трэба ж, як цікава атрымалася!»)

Былі, на жаль, і іншыя выпадкі на гульнях... «П'едэстал гонару» ў спаборніцтвах па бегу занялі цемнаскурыя «жанчыны» з Паўднёвай Афрыкі, Бурундзі і Кеніі. Чаму словы ў двукоссях? Карыстальнікі сеціва адкрыта назвалі «атлетаў» гэтага забегу «мутантамі, жудасным відовішчам». («Як ты мог пераспаць з Наташкай? Яна ж страшная!» — «І дужая...») Карацей кажучы, і па знешнім выглядзе, і па выніках гэта хутчэй мужчыны. Прадстаўнік НАК Беларусі падзякаваў нашай спартсменцы ў бегу на 800 метраў за яе сёмы вынік менавіта з гэтай прычыны. «Не стану аспрэчваць рашэнне Міжнароднай федэрацыі лёгкай атлетыкі, але, калі хочаце прадаставіць такім людзям магчымасць выступаць, стварыце трэцюю катэгорыю», — сказаў ён. Шкада, што такія відавочныя рэчы нехта не хоча разумець. («Спрачацца з трэнерам па барацьбе можа толькі трэнер па стральбе».)

...Што і гаварыць, спартсмены з нас далёка не ўсе. Як і атлетычная фігура далёка не ў кожнага. («Самы распаўсюджаны від плавання — пакрысе заплываць тлушчам».) І менавіта спартыўныя тэлеперадачы, у тым ліку і трансляцыі з Алімпійскіх гульняў, дазваляюць многім называць сябе балельшчыкамі. Ну так, бывае, што і пад піва з чыпсамі ідуць такія прагляды, і жывоцікі ў аматараў таго ці іншага віду спорту пасля адпаведныя... («Скажы, ты можаш падняць сто кілаграмаў?» — «Ну я ж неяк ранкам устаю з ложка!») Але, назіраючы за баталіямі на экране, нехта, магчыма, не-не ды і крытычна ацэньваў сваю ўласную фігуру. А потым, глядзіш, і фізічнымі практыкаваннямі пачаў займацца. Не для рэкордаў, а для тонусу і прыгажосці цела. У кожнага свая Алімпіяда і свая барацьба за ўзнагароды...

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

Танцы, сонца, рок-н-рол з беларускім акцэнтам

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— І як беларуская публіка ўспрымае музыку?

— Прыязна. Але калі мы спрабуем зладзіць сольныя канцэрты, то людзей шмат сабраць не атрымліваецца. Калі ж іграем з іншымі гуртамі, то канцэрты маюць поспех, асабліва пры ўмове бясплатнага ўваходу. Прыходзіць многа слухачоў, нас хваляць, што выступаем вельмі прафесіянальна. Гэта прыемна. Маем і сваю публіку.

— Канкурэнцыя вялікая?

— Не. Цяпер папулярная крыху іншая музыка. Мне вельмі падабаецца The Silicon з-за чысціні жанру. Выдатна, калі музыканты прытрымліваюцца аднаго стылю, а не спрабуюць іх змешваць, каб прыцягнуць больш увагі, напрыклад, іграюць рок-н-рол з дыджэямі, сумяшчаючы песні з моднымі рытмамі.

«Цікава, што ў Мінску сёрф-рок пачалі іграць яшчэ ў савецкія часы. Тут існаваў гурт «Алгарытмы», а ў 1968 годзе праходзіў фестываль біт-ансамбляў, падчас якога гучаў і сёрф».

— Ці можна цябе назваць кансерватарам у музыцы?

— Так. Калі пачынаеш эксперыментаваць, вельмі хутка разумееш, што ўсё даўно прыдумана. На жаль. Я люблю, калі ў кампазіцыі ёсць дакладная мелодыя, стыль. Гэта не зусім кансерватызм, я прымаю эксперыменты, але блюз павінен заставацца блюзам, рок-н-рол — рок-н-ролам. Хоць цяпер усё — рок-н-рол: і Элвіс Прэслі, і гурт «Чайф».

— Кампазіцыі The Silicon у большасці выпадкаў інструментальныя, без слоў. Ці хутка з'явіцца вакал?

— Ён ужо ёсць! Паступова складваецца так, што палова выступлення — інструментальныя кампазіцыі, а палова — вакальныя. Аднымі інструментальнымі рэчамі вельмі складана трымаць публіку. Таму даводзіцца спяваць, і мы ўжо навучыліся.

— Сёрф, напэўна, адзіны стыль, дзе прыкметай якасці лічыцца добрае выкананне кавераў на класіку жанру. Гэта сапраўды так?

— У новым альбоме ўсе кампазіцыі нашы, а ў першым, Desert Storm, сапраўды было некалькі кавераў. Але ж і яны розныя бываюць. Я лічу, што калі песні споўнілася больш за 30 гадоў і ты іграеш яе ў стылі 1960-х, то гэта даніна павагі той музыцы, знак, што яе не забываюць. Проста даеш ёй новае жыццё.

— А як крытыкі ўспрынялі ваш веснавы цалкам інструментальны альбом Tiki Tohua?

— Мы адпраўлялі яго за мяжу, на радыёстанцыі, якія транслююць музыку 1950-1960-х гадоў, у Іспанію, Штаты. Там яго вельмі добра прынялі, а кампазіцыя Mysterious Island доўгі час знаходзілася на другім месцы ў хіт-парадзе, яе часта давалі ў эфір, былі станоўчыя водгукі. За мяжой музыка ў стылі сёрф больш распаўсюджаная. У нас жа крытыкі сказалі: сёрф і сёрф. Іншага мы і не чакалі. Няма з кім параўноўваць... Дзіўна, калі нас пачынаюць ацэньваць на адным узроўні з гуртамі Navi або Shuma — мы ж іграем абсалютна розную музыку.

— Зразумела, што пад сёрф трэба танцаваць. А для чаго яшчэ падыходзіць такая музыка?

— Ды для чаго заўгодна. Можна ехаць на машыне і слухаць, у кватэры прыбіраць, проста гуляць па вуліцах. Я люблю пад сёрф ездзіць на скейтбордзе, сноўбордзе.

— Ты яшчэ іграеш на гітары ў гурце «Петля пристрастия», гэта каманда з зусім іншым стылем. Не складана пераключацца?

— Не, бо ў тым гурце я не выступаю як аўтар музыкі, толькі як аранжыроўшчык. Асноўны генератар ідэй — вакаліст Ілья Чарапко, астатнія музыканты проста прапрацоўваюць яго задумкі. Мне вельмі падабаецца іграць там. Калектыў добры. Мы разам аб'ездзілі шмат гарадоў і ні разу не пасварыліся. Гэта выдатна.

— Паслухаць The Silicon можна толькі ў Мінску?

— З прэзентацыяй нашага новага альбома мы ездзілі ў Маскву і Піцер. Не так даўно вярнуліся са Смаленска. У нас і там ёсць свая аўдыторыя. Сёрф-музыканты з Піцера і Масквы ведаюць нас, лічаць нядрэннай камандай.

«Сёрф-рок зарадзіўся і развіўся ў Каліфорніі, ЗША ў канцы 1950-1960-х гадоў, а каралём стылю лічыцца гітарыст Дзік Дэйл, які, дарэчы, мае беларускія карані».

— Як сябе рэкламуеце, каб арганізатары канцэртаў імкнуліся запрасіць менавіта вашу каманду?

— Ды асаблівага піяру няма. У Мінску нас і так усе ўжо ведаюць *(смяецца)*. На жаль, у Беларусі музыкант павінен быць і рэкламшчыкам, і гукарэжысёрам, і сам сабе ладзіць канцэрт, нават кветкі прадаваць. Сапраўды, цяпер вельмі складаны час. У нашы дні можна хутка навучыцца іграць, якасныя інструменты даступныя, таму і канкурэнцыя вялікая. Раней у людзей было больш ідэй, а рэалізаваць іх тэхнічна было складаней. Цяпер наадварот: тэхнічна ўсё даступнае, а ідэі некуды зніклі, усе гурты адзін да аднаго падобныя. Да таго ж у нас у краіне рынак вельмі маленькі. Нават вядомыя выканаўцы не могуць часта выступаць, збіраць вялікія клубы. Толькі раз на трычатыры месяцы, часцей няма сэнсу, бо аўдыторыя вельмі абмежаваная па колькасці, так часта ніхто не будзе хадзіць на канцэрты. Мне ж як музыканту хочацца выступаць часта.

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 31.08.2016 г.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «МТБИНГО»

Настоящие правила проведения рекламной игры «МТБинго» (далее — Правила), направленной на стимулирование безналичных операций, осуществляемых по банковским платежным карточкам, эмитированным ЗАО «МТБанк», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «МТБинго» (далее — Рекламная игра).

Организатор Рекламной игры

Организатором Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Пиар квадрат», УНП 191682518, зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 7 июля 2011 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191682518 (далее — Организатор). Юридический адрес Организатора: Республика Беларусь, 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, пом. 24.

Заинтересованные лица Рекламной игры:

Заинтересованными лицами Рекламной игры являются:
ЗАО «МТБанк», г. Минск, Партизанский пр-т, 6а
ООО «Триовист», г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 610
ЗАО «Патио», г. Минск, пр-т Независимости, д. 58, этаж 3, комн. 301
ООО «Патио плюс», г. Минск, ул. Короля, д. 51
СООО «Зико», г. Минск, ул. Чайковского, 73 А, комн. 27
ООО «ЛидерМатрасМаркет», г. Минск, ул. К. Цеткин, 51, оф. 501
ГП «Аква-Минск», г. Минск, пр. Рокоссовского, д. 44
ЧП «К плюс С», Минский район, д. Каменная Горка, ул. Садовая, д. 1В-2
ИУП «БелВиллесден», г. Минск, пер. Асаналиева, 3, к. 20
ЧП «Сапогетти», г. Минск, ул. Ольшевского, д. 24. к. 3, каб. 2
ОАО «Галантэя», г. Минск, ул. Цеткин, д. 18
ТЧУП «Косметика Плюс», г. Минск, пр. Независимости, 48.
ЧУО «Центр повышения квалификации руководящих работников и специалистов Бизнес-школа ИПМ», г. Минск, пр-т Газеты «Правда», 11В
ОАО «Санаторий Озерный», Гродненская обл., Гродненский р-н, а.г. Озеры.
СБА ЗАСО «Купала», г. Минск, ул. Немига, 40
ООО «Торговая шинная компания», г. Минск, пер. Липковский, 24
ООО «Еврозапчасть», г. Минск, ул. Притыцкого, 62-12-302

Участники Рекламной игры

Участниками рекламной игры могут быть физические лица – держатели банковских платежных карточек, которые совершили в организациях торговли (сервиса) операцию оплаты товаров, работ или услуг с использованием банковской платежной карточки, эмитированной ЗАО «МТБанк» (далее – Карточка), на любую сумму от 30,00 белорусских рублей в денежных знаках образца 2009 г. (300 000 белорусских рублей в денежных знаках образца 2000 г.) и более в одном чеке (далее – Операция) в период с 7.09.2016 по 28.10.2016 включительно (далее – Участник).

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет, а также иностранные граждане и лица без гражданства, достигшие 18 лет, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

1. **Название Рекламной игры: «МТБинго».**
2. **Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.
3. **Дата начала Рекламной игры:** 7 сентября 2016 г.
4. **Дата окончания Рекламной игры:** 30 ноября 2016 г.
5. **Наименование услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** безналичные операции, осуществляемые с помощью банковских платежных карточек, эмитированных ЗАО «МТБанк».
6. **Порядок участия в ежедневных розыгрышах Призов и розыгрыше Главного Приза**

6.1. Для участия в Рекламной игре Участнику необходимо в период с 7 сентября 2016 года по 28 октября 2016 года:

- Осуществить безналичную операцию оплаты товаров, работ или услуг с использованием Карточки на сумму от 30,00 белорусских рублей в денежных знаках образца 2009 г. (300 000 белорусских рублей в денежных знаках образца 2000 г.) и более в одном чеке на территории РБ или за ее пределами.

Сумма Операции в валюте, отличной от валют, указанных в предыдущем абзаце, определяется как эквивалент в валюте текущего счета, операции по которому совершаются с использованием Карточки. Для определения точной суммы эквивалента используется обменный курс банка-эмитента, установленный для проведения операций при использовании Карточек, и (или) обменный курс, установленный платежной системой на момент осуществления дебетовой авторизации.

- Сохранить документ, подтверждающий осуществление расчетов по операциям с использованием банковских карточек, а также служащий подтверждением их совершения (далее – карт-чек) в бумажном или электронном виде.
- Выбрать любой Приз любого ежедневного розыгрыша Призов (за исключением розыгрышей призов в дни, предшествующие регистрации Операции; дня регистрации Операции; Главного Приза), в розыгрыше которого Участник хочет участвовать.
- Ввести Регистрационные данные на странице Рекламной игры www.mtbingo.by либо по телефону 509 99 99 (для всех мобильных операторов) или + 375 17 229 99 99 (для городского номера) круглосуточно и без выходных дней (звонок по Беларуси бесплатный (за исключением оплаты услуг мобильного оператора)) (далее – регистрация по телефону ОКЦ МТБанка):
  - дата совершения Операции;
  - сумма Операции и валюта Операции;
  - код авторизации (код, подтверждающий осуществление банком-эмитентом авторизации; состоит, как правило, из 6 цифр и печатается в карт-чеке)*;

*В случае если Участник не сохранил карт-чек, узнать код авторизации можно по телефону 509 99 99 (для всех мобильных операторов) или + 375 17 229 99 99 (для городского номера) круглосуточно и без выходных дней (звонок по Беларуси бесплатный (за исключением оплаты услуг мобильного оператора)).

  - последние 4 цифры Карточки Участника;
  - фамилия, имя и отчество Участника;
  - дата розыгрыша;
  - номер мобильного телефона Участника;
  - адрес электронной почты Участника (при наличии);
  - почтовый адрес Участника (индекс, населенный пункт, улица, дом, корпус (при наличии), номер квартиры (при наличии)).

Все участники Рекламной игры, зарегистрировавшие в соответствии с текущим разделом Правил Операцию на сумму от 100,00 белорусских рублей в денежных знаках образца 2009 г. (1 000 000 белорусских рублей в денежных знаках образца 2000 г.) и более в одном чеке на территории РБ или за ее пределами, автоматически становятся участниками розыгрыша Главного приза.

6.2. В Рекламной игре не участвуют следующие Операции:

- Операции, проводимые через платежный сервис ООО «ВЭБ ПЭЙ»,
- Операции, проводимые в устройствах самообслуживания, которым присвоен код MCC 6010, 6011, 6012 или 4900 (таких, как банкоматы, инфокиоски и т.п.),
- Операции безналичной оплаты в казино (код MCC 7995),
- Операции безналичной оплаты через СДБО «Интернет Банк» (перевод денежных средств со Счета, в т.ч. перевод с Карточки на Карточку, погашение кредита, осуществление произвольного платежа),
- Операции безналичной оплаты в устройствах банков (код MCC 9402), установленных в РУП «Белпочта»,
- Операции перевода между Карточками с использованием сервиса «Denegram» либо аналогичных сервисов, предоставляемых другими банками.

7. Уведомление об успешной регистрации с присвоением Порядкового номера Участника (1000000, 1000001, 1000002 и т.д., присвоенный согласно времени и дате регистрации) и дату розыгрыша, в которых участвует данный Порядковый номер, Участник получает в диалоговом окне на странице Интернет-сайта www.mtbingo.by либо по телефону от специалиста – при осуществлении Участником регистрации по телефону ОКЦ МТБанка.

8. Количество Операций, которые может зарегистрировать один Участник, не ограничено.

9. Одна операция участвует в одном розыгрыше одного Приза, который выбрал Участник. В случае попытки регистрации Участником данных одной и той же безналичной Операции дважды повторные данные не будут приниматься к участию в Рекламной игре.

10. Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные Участниками рекламной игры при регистрации данных на Интернет-сайте www.mtbingo.by, а также по телефону ОКЦ МТБанка. При обнаружении синтаксических ошибок в регистрационных данных, которые не оказывают влияния на идентификацию Участника, Операция принимает участие в розыгрыше на общих основаниях.

11. Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных Операций Победителями Рекламной игры.

12. **Призовой фонд Рекламной игры, источники его формирования. Даты проведения Розыгрышей призового фонда**

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет денежных средств и имущества Заинтересованных лиц в размере 214 396,55 (двести четырнадцать тысяч триста девяносто шесть) белорусских рублей и пятьдесят пять копеек в денежных знаках 2009 г., или 2 143 965 500 (два миллиарда сто сорок три миллиона девятьсот шестьдесят пять тысяч пятьсот) белорусских рублей в денежных знаках 2000 г.

Призовой фонд Рекламной игры включает следующие Призы:

№	Наименование приза	Заинтересованное лицо, предоставившее Приз	Стоимость с НДС за ед. бел. руб. (ден. знаки 2009 г./ ден. знаки 2000 г.)	ИТОГО стоимость с НДС бел. руб. (ден. знаки 2009 г./ ден. знаки 2000 г.)	Даты розыгрышей
Ежедневные розыгрыши призов					
1	Телевизор LED LG 49LF510V	ЗАО "Патио"	792,56/ 7 925 600	4755,36/ 47 553 600	8.09.2016; 18.09.2016; 23.09.2016; 9.10.2016; 23.10.2016; 29.10.2016;
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	103,63/ 1 036 300	621,81/ 6 218 124	
2	Ноутбук HP 250 (M9S70EA)	ООО "ТРИОВИСТ"	460,66/ 4 606 600	460,66/ 4 606 600	8.09.2016.
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	54,04/ 540 400	54,04/ 540 400	
3	Беговел Sundays YM-07 (зеленый)	ООО "ТРИОВИСТ"	69,09/ 690 900	69,09/ 690 900	8.09.2016.
4	Телефон GSM HTC Desire EYE EEA голубой	ООО "ПАТИО ПЛЮС"	672,13/ 6 721 300	672,13/ 6 721 300	8.09.2016.
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	85,64/ 856 400	85,64/ 856 400	
5	Сертификат на приобретение матрасов Vegas (до 31.11.2016 г.)	ООО "Лидер Матрас Маркет"	200,00/ 2 000 000	20 800,00/ 208 000 000	8-18.09.2016 (2 шт.); 19.09.2016 (3 шт.); 20-26.09.2016 (2 шт.); 27.09.2016 (3 шт.); 28-29.09.2016 (2 шт.); 1.10.2016 (2 шт.); 2-3.10.2016 (3 шт.); 4.10.2016 (2 шт.); 5.10.2016 (3 шт.); 6.10.2016 (2 шт.); 8-9.10.2016 (2 шт.); 10.10.2016 (3 шт.); 11-13.10.2016 (2 шт.); 15-26.10.2016 (2 шт.); 27.10.2016 (3 шт.); 28.10.2016 (2 шт.); 29.10.2016 (1 шт.);
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	15,09/ 150 900	1569,56/ 15 695 632	
6	Подарочный сертификат для приобретения товара в торговых объектах "Зико" (до 31.12.2016 г.)	СООО "Зико"	300,00/ 3 000 000	21 000,00/ 210 000 000	8.09.2016 (1 шт.); 9.09.2016 (2 шт.); 10.09.2016 (2 шт.); 11.09.2016 (2 шт.); 12-29.09.2016 (1 шт.); 1-6.10.2016 (1 шт.); 7.10.2016 (15 шт.); 8-13.10.2016 (1 шт.); 15.10.2016 (2 шт.); 16-21.10.2016 (1 шт.); 22.10.2016 (2 шт.); 23-27.10.2016 (1 шт.); 28.10.2016 (2 шт.); 29.10.2016 (1 шт.);
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	30,03/ 300 300	2102,41/ 21 024 138	
7	Сертификат для реализации в магазинах сети "Гиппо" (до 8.11.2017 г.)	ИУП "Бел-Виллесден"	100,00/ 1 000 000	5200,00/ 52 000 000	8-18.09.2016 (1 шт.); 19.09.2016 (2 шт.); 20.09.2016 (1 шт.); 21.09.2016 (2 шт.); 22.09.2016 (1 шт.); 23.09.2016 (2 шт.); 24-29.09.2016 (1 шт.); 1-6.10.2016 (1 шт.); 8-13.10.2016 (1 шт.); 15-29.10.2016 (1 шт.);
8	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	0,14/ 1 400	7,77/ 77 701	
9	Пакет подарочных сертификатов для реализации в сети магазинов "Galanteya" (до 10.11.2016 г.)	ОАО "Галантэя"	100,00/ 1 000 000	5200,00/ 52 000 000	8-15.09.2016 (1 шт.); 16.09.2016 (2 шт.); 17-27.09.2016 (1 шт.); 28.09.2016 (2 шт.); 29.09.2016 (1 шт.); 1-6.10.2016 (1 шт.); 8-11.10.2016 (1 шт.); 12.10.2016 (2 шт.); 13.10.2016 (1 шт.); 15-29.10.2016 (1 шт.);
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	0,14/ 1 400	7,77/ 77 701	
10	Подарочный Сертификат "Sister`s" (до 01.01.2017 г.)	ЧП "Сапогетти"	300,00/ 3 000 000	7800,00/ 78 000 000	8.09.2016; 10.09.2016; 12.09.2016; 14.09.2016; 16-17.09.2016; 19.09.2016; 21.09.2016; 23.09.2016; 25.09.2016; 27.09.2016; 29.09.2016; 1.10.2016; 3.10.2016; 5.10.2016; 9.10.2016; 11.10.2016; 13.10.2016; 15.10.2016; 17.10.2016; 19.10.2016; 21.10.2016; 23.10.2016; 25.10.2016; 27.10.2016; 29.10.2016.
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	30,03/ 300 300	780,89/ 7 808 965	
11	Сертификат для реализации в розничной сети магазинов "К+С" (до 31.12.2016)	ЧП "К плюс С"	100,00/ 1 000 000	2000,00/ 20 000 000	8-9.09.2016; 12.09.2016; 14.09.2016; 17.09.2016; 23-24.09.2016; 27.09.2016; 29.09.2016; 1.10.2016; 4.10.2016; 6.10.2016; 9.10.2016; 11.10.2016; 13.10.2016; 15.10.2016; 18.10.2016; 20.10.2016; 28-29.10.2016.
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	0,14/ 1 400	2,98/ 29 885	
12	Сертификат для реализации в магазинах "Ив Роше" (до 1.02.2017 г.)	ТЧУП "Косметика Плюс"	100,00/ 1 000 000	2000,00/ 20 000 000	8-14.09.2016; 22-28.09.2016; 13.10.2016; 15-18.10.2016; 29.10.2016.
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	0,14/ 1 400	2,98/ 29 885	
13	Сертификат, удостоверяющий право на получение образовательной услуги в течение 2016 г.	ЧУО "Центр повышения квалификации руководящих работников и специалистов Бизнес-школа ИПМ"	500,00/ 5 000 000	5000,00/ 50 000 000	8.09.2016; 13.09.2016; 20.09.2016; 26.09.2016; 3.10.2016; 10.10.2016; 17.10.2016; 19.10.2016; 24.10.2016; 29.10.2016.
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	59,91/ 599 100	599,19/ 5 991 954	
14	Сертификат на покупку автозапчастей в сети магазинов ARMTEK (до 01.03.2017 г.)	ООО "Евро-запчасть"	300,00/ 3 000 000	7800,00/ 78 000 000	8-9.09.2016; 11-12.09.2016; 14.09.2016; 16.09.2016; 18.09.2016; 20.09.2016; 22.09.2016; 24.09.2016; 26.09.2016; 28.09.2016; 2.10.2016; 4.10.2016; 6.10.2016; 8.10.2016; 10.10.2016; 12.10.2016; 16-18.10.2016; 20.10.2016; 22-24.10.2016; 29.10.2016;
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	30,03/ 300 300	780,89/ 7 808 965	
15	Сертификат на отдых выходного дня в санатории Озерный (до 15.12.2016 г.)	ОАО "Санаторий "Озерный"	445,2/ 4 452 000	9794,40/ 97 944 000	8.09.2016; 11.09.2016; 13.09.2016; 15.09.2016; 18.09.2016; 20.09.2016; 22.09.2016; 25.09.2016; 27.09.2016; 29.09.2016; 2.10.2016; 4.10.2016; 6.10.2016; 9.10.2016; 11.10.2016; 13.10.2016; 16.10.2016; 18.10.2016; 20.10.2016; 23.10.2016; 25.10.2016; 27.10.2016.
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	51,73/ 517 300	1138,08/ 11 380 827	
16	Сотовый телефон Samsung SM-A500F (SM-A500FZKD-SER)	ЗАО "Патио"	411,35/ 4 113 500	2879,45/ 28 794 500	9.09.2016; 13.09.2016; 20.09.2016; 27.09.2016; 4.10.2016; 11.10.2016; 18.10.2016.
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	46,67/ 466 700	326,71/ 3 267 109	
17	Подарочный сертификат 21vek.by (до 30.06.2017 г.)	ООО "ТРИОВИСТ"	70,00/ 700 000	3640,00/ 36 400 000	9.09.2016 (2 шт.); 10-16.09.2016 (1 шт.); 18-24.09.2016 (1 шт.); 26-29.09.2016 (1 шт.); 30.09.2016 (4 шт.); 2-6.10.2016 (1 шт.); 8-13.10.2016 (1 шт.); 14.10.2016 (4 шт.); 16-25.10.2016 (1 шт.); 26.10.2016 (2 шт.); 27.10.2016 (1 шт.).
18	Подарочный сертификат 21vek.by (до 30.06.2017 г.)	ООО "ТРИОВИСТ"	50,00/ 500 000	600,00/ 6 000 000	13.09.2016; 15.09.2016; 19.09.2016; 22.09.2016; 23.09.2016; 26.09.2016; 4.10.2016; 10.10.2016; 18.10.2016; 20.10.2016; 22.10.2016; 24.10.2016.
19	Стиральная машина BOSCH WLG 2026SOE	ООО "ТРИОВИСТ"	436,92/ 4 369 200	436,92/ 4 369 200	9.09.2016.
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	50,49/ 504 900	50,49/ 504 900	
20	Подарочный сертификат на товары категории "Сантехника" (до 30.06.2017 г.)	ООО "ТРИОВИСТ"	150,00/ 1 500 000	300,00/ 3 000 000	9.09.2016, 24.09.2016.
	Денежное вознаграждение	ЗАО "МТБанк"	7,62/ 762 000	15,24/ 152 413	

